Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял вышлецца—а 9-й да 3½ гадз. Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капітэрлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капітэрлі пасьлядо тэксту 1 р. — к. За радок капітэрлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі на 50 проц. дазволены. Зыш тарыфу бароцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. аддзелах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 63 (2552) Чацьвер, 21-га сакавіка 1929 г.

САМАПРАВЕРКА І САМАКРЫТЫКА.

(ДА АБСЬЛЕДАВАНЬНЯ ПРАЦЫ КП(б) БЕЛАРУСІ).

У сучасны момант праводзіцца плянавае інструктарскае абсьледаваньне ЦК УсеКП(б) усёй працы нашай арганізацыі.

Якія канкрэтныя мэты ставіць перад сабою абсьледаваньне ЦК УсеКП(б) нашай арганізацыі?

У асноўным гэтыя мэты зводзяцца да наступнага. Раней усяго ў адносінах гаспадарчага будаўніцтва, у першую чаргу—у галіне сельскае гаспадаркі, паколькі Беларусь—пераважна сялянская краіна, і сельская гаспадарка мае ва ўсёй нашай эканоміцы галоўнае значэньне.

У гэтай галіне перад абсьледаваньнем стаіць задача: высьвяліць прычыны ваўважанага зьніжэньня ўраджайнасьці тэхнічных і зернавых культур і зьмяншэньня таварнае долі ў валавой прадукцыі сельскае гаспадаркі Беларусі. Гэта зьявішча адбываецца на фоне значных дасягненьняў у адносінах бязупыннага з году ў год росту пасеўных плошчаў, павялічэньня колькасьці рабочае і буйнае рагатае жывёлы, сыстэматычнага павялічэньня дастаўкі беларускай вёскі сельска-гаспадарчых машын, правядзеньня землеўпарадкаваньня амаль на палове ўсяе пасеўнае плошчы і інш. Тым больш неабходна, зразумела, высьвяліць прычыны вышэйпамянёных адмоўных зьявішчаў у нашай сельскай гаспадарцы. Гэта неабходна для таго, каб ведаць, куды менавіта накіроўваць удар, вакол чаго мабілізаваць масы, каб перамагчы гэтыя цяжкасьці. Адначасова з першай задачай абсьледаваньня паўстае другая: наколькі зьвернута ўвага партыйных і савецкіх органаў Беларусі на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі, і якія рэальныя меры ўжыты для забесьпячэньня ўздыму ўраджайнасьці і таварнасьці сельскае гаспадаркі, асабліва па зернавых і тэхнічных культурах, наколькі наша зямельная, крэдытная і каапэрацыйная палітыка дапамагае далейшаму росту калгасаў, як умацоўваецца ўплыў апошніх на абкружаючыя сялянскія гаспадаркі, наколькі сельска-гаспадарчая каапэрацыя дапамагае ўздыму бядняцкіх і незаможных гаспадарак у барацьбе з уплывам кулацтва і інш.

Усе гаспадарчыя і культурныя мерапрыёмствы партыйнай і савецкай улады на вёсцы павінны праводзіцца шляхам уцягненьня шырокіх бядняцкіх, батрацкіх і серадняцкіх пластоў вёскі. Гэта ўцягненьне ажыцьцяўляецца, галоўным чынам, праз сельсаветы і работу з беднатой.

Лясная гаспадарка ў Беларусі мае, як вядома, буйнейшае значэньне (47 проц. усіх прыбыткаў бюджэту на 1927-28 г.—ад лесу). Задача абсьледаваньня—праверыць кіраўніцтва лясной гаспадаркай з пункту погляду палепшаньня арганізацыі і кіраўніцтва лясамі і зьніжэньня сабекошту лесаматар'ялу. З другога боку, неабходна высьвяліць уплыў лясное гаспадаркі на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі наогул, (вядома, што ад адных толькі лясных заработкаў сялянства Беларусі мае штогод 10-12 млн. руб.), асабліва на разьвіцьцё бядняцкіх і незаможных пластоў вёскі з пункту гледжаньня арганізацыі іх працы ў лесараспрацоўках.

Наша беларуская вёска ня ведае інстытуту зямельных таварыстваў. Для працы сельсаветаў, такім чынам, у нас адкрыта большае поле дзейнасьці, чымся у РСФСР. Таму ў задачу абсьледаваньня ўваходзіць праверка і вывучэньне становішча вопыту работы нашых сельсаветаў, як з пункту погляду ўцягненьня і арганізацыі бядняцка-серадняцкіх мас і батракоў навакол асноўных гаспадарчых і культурных мерапрыёмстваў партыі і савецкай улады на вёсцы, так і ў адносінах арганізацыі і палітыка-выхаваўчае працы сярод батрацтва і сельска-гаспадарчых рабочых, з пункту погляду ўзмацненьня іх уплыву на грамадзкае жыцьцё вёскі. Трэба праверыць, як на справе ўдзяльнічаюць батрацка-бядняцкія масы ў справе землеўпарадкаваньня, разьмеркаваньня крэдытаў, машын, лесадастаўкі, у будаўніцтве калгасаў, як нашы нізавыя арганізацыі вытрымліваюць барацьбу з кулацтвам і перамагаюць яго адпор сацыялістычнаму наступу, бароначы свае клясавыя інтарэсы.

Пытаньні прамысловага будаўніцтва. На аснове бурнага росту прамысловасьці Беларусі задача абсьледаваньня ў праверцы таго, наколькі прамбудаўніцтва ўплывае на рост і рэканструкцыю нашае сельскае гаспадаркі, якая эфэктыўнасьць капітальнага будаўніцтва, якія былі мерапрыёмствы па рацыяналізацыі вытворчасьці, зьніжэньню сабекошту і ўзьняцьцю прадукцыйнасьці працы, якія кадры прамысловасьці, і як стаіць справа з іх падрыхтоўкай, асабліва спэцыялістаў і наогул тэхнічнага пэрсаналу для прамысловасьці. Праверка стану масавае працы на прадпрыёмствах: вывучэньне складу рабочых, асабліва новых пластоў і працы з імі, работа біржаў працы в пункту гледжаньня адбору пасылаемых імі на прадпрыёмствы рабочых, работа прафсаюзаў па інтэрнацыянальнаму выхаваньню і культурнаму разьвіцьцю рабочых, стан кадраў прафсаюзаў і інш. грамадзкіх арганізацый, работа прафсаюзаў у арганізацыі мас навакол вытворчых задач на прадпрыёмстве, работа гарсаветаў па абслугоўваньню бытавых патрэб рабочых і інш.—асноўныя задачы абсьледаваньня ў гэтай галіне. Галоўнае тут—праверыць, як нізавыя арганізацыі падышлі да вырашэньня гэтае цэнтральнае праблемы: зьніжэньне сабекошту і ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы.

Саматужна-прамысловая каапэрацыя моцна разьвіта ў Беларусі (па валавой прадукцыі ўсяе прамысловасьці саматужная прамысловасьць займае 62 проц.). Задача: праверка працы па арганізацыі саматужнае прамысловасьці навакол саматужна-прамысловай каапэрацыі, галоўным чынам, па лініі вытворчага каапэраваньня, пытаньні ўрэгуляваньня забесьпячэньня саматужнай прамысловасьці, пытаньні збыту саматужна-прамысловай прадукцыі (барацьба з прыватнікам) і, нарэшце, палітычная праца сярод саматужнікаў—зьяўляюцца важнымі задачамі ў умовах Беларусі.

БССР—рэспубліка нацыянальная, прытым шматнацыянальная (і прыгранічная). Таму абсьледаваньне ставіць сваёй задачай праверку выкананьня нацыянальнае палітыкі (на часьці беларусізацыі апарату) в пункту погляду ўстанаўленьня больш моцнае сувязі паміж савецкімі органамі і працоўнымі рэспублікі, умацаваньня саюзу БССР в СССР (эканамічнага і культурнага), барацьба з ухіламі, нацыяналізмам і нацыянальнай замкнёнасьцю сярод асобных нацыянальнасьцей і, нарэшце, абарона інтарэсаў нацменшасьцей. У адносінах культурнага будаўніцтва асноўнымі задачамі абсьледаваньня зьяўляюцца: праверыць, наколькі задачы культурнага будаўніцтва адпавядаюць інтарэсам падаўляючага народнае гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва, як абслугоўваюцца рабочыя і бядняцка-батрацкія пласты вёскі, зьмест працы навуковых устаноў в пункту гледжаньня інтэрнацыянальнага выхаваньня моладзі, стан кадраў культурных працаўнікоў, мерапрыёмствы па больш шпаркаму ажыцьцяўленьню ліквідацыі няпісьменнасьці, абслугоўваньне інтарэсаў нацменшасьцей. Неабходна далей праверка нацыянальна-культурнага будаўніцтва з пункту гледжаньня ідэалёгічнае і клясавае вытрыманасьці і зразумеласьці мовы выдаваемай літаратуры, як на беларускай так і на яўрэйскай і польскай мовах, сувязь літаратуры, тэатру, навуковых устаноў БССР з літаратурай, тэатрам і навуковымі ўстановамі РСФСР і УССР, як меры братэрскага сужыцьця з народамі СССР.

Праблемы яўрэйскага мястэчка таксама не абмінаюцца абсьледаваньнем. Павінна быць праверана эфэктыўнасьць землеўпарадкаваньня і землякарыстаньня працоўных яўрэяў, падрыхтоўка працоўных мястэчак для ўцягненьня ў прамысловасьць, каапэраваньне местачковых саматужнікаў і інш.

Апошняя група пытаньняў абсьледаваньня—пытаньні партбудаўніцтва. Наша арганізацыя штогод расьце, паляпшаецца і яе сацыяльны склад, разьвіваецца ўнутрыпартыйная дэмакратыя і самакрытыка.

Аднак, нязначнасьць пралетарскае базы ў Беларусі, наяўнасьць даволі значнае праслойкі ў КП(б)Б выхадцаў з іншых партый ставіць пытаньні вывучэньня складу КП(б)Б і наогул унутрыпартыйнага будаўніцтва на першы плян. Абсьледаваньне ставіць у гэтых адносінах наступныя задачы: праверыць стан заводзкіх ячэек па якасьці складу камуністаў у іх, тэмп вярбоўкі ў партыю, працу з беспартыйным актывам, ідэйна-палітычную вытрыманасьць камуністаў, пытаньні барацьбы з ухіламі, асабліва з правым і прымірэнцтвам, як ідэйную, так і ў практыцы, у штодзённай працы, уплыў ячэйкі на беспартыйныя масы рабочых і сялян, мерапрыёмствы па ўцягненьню ў партыю сельска-гаспадарчых рабочых (асабліва ў савгасах)—батраку, беднаты і незаможных і „пераводу" гаспадарак сялян-камуністаў у калгасы, пытаньні барацьбы з бюракратызмам і засьмечанасьцю дзяржаўнага і каапэрацыйнага апарату, падрыхтоўка рабочых, батракоў і беднаты для вылучэньня, пасылка адказных працаўнікоў на нізавую працу, правядзеньне ўнутрыпартыйнае дэмакратыі і самакрытыкі, настаноўка палітыка-выхаваўчае працы і кіраўніцтва камсамолам і жаночай працай.

Весь у асноўным задачы абсьледаваньня. Зусім зразумелы цяжкасьць і складанасьць выкананьня гэтых задач, наколькі абсьледаваньне ахапляе цэлую напрэспубліку і прытым за доўгі пэрыяд часу. Для ўзмоцненага правядзеньня абсьледаваньня неабходна ў працу па абсьледаваньню на пачатках самакрытыкі і самаправеркі ўцягнуць сотні і тысячы мясцовых працаўнікоў—камуністаў, рабочых, сялянскі актыў, рабселькораў, сканцэнтраваць навакол гэтае справы партыйную і пралетарскую грамадзкую думку і ўвагу. Сёняшняя адозва ЦК КП(б)Б заклікае мясцовыя арганізацыі да ўсебаковае дапамогі працы па абсьледаваньню. Кожны камуніст, кожны беспартыйны актывіст павінен дапамагчы выяўленьню вопыту, дасягненьняў і хібаў у працы нашай арганізацыі, каб тым хутчэй гэтыя хібы зьнішчыць.

Абсьледаваньне-самаправерка, дапавая самакрытыка—вось лёзунг, пад якім павінна быць праведзена ўся гэта аграмадная работа.

Тав. Дорыё прызнаў свае памылкі.

ФРАНЦУСКАЯ КАМПАРТЫЯ ЦЬВЁРДА ПРАВОДЗІЦЬ ЛІНІЮ VI КАНГРЭСУ КАМІНТЭРНУ.

ПАРЫЖ, 19-3. На канфэрэнцыі кампартыі Парыскага вокругу выступіў т. Дорыё, які заявіў: «калі ў свой час я пярэчыў супроць тактыкі кампартыі на выбарах, дык цяпер пераканаўся ў памылковасьці маёй пазіцыі, у памылковасьці падзяленьня сацыялістаў на правых і левых, бо на практыцы барацьбы і камуністычнае партыі і падтрыманьні буржуазеі яны аказваюцца проста праваю і леваю дугою адной і той-жа разлажыўшайся сацыялістычнае справы». Далей Дорыё прызнае, што магутны стачачны рух апошніх месяцаў, якім кіравала кампартыя, пераканаў яго ў бязгрунтоўнасьці яго думкі, што рабочыя масы не зразумеюць новае тактыкі французкае кампартыі на выбарах і што гэта падарве ўплыў партыі. Дорыё прызнае таксама, што яго прапанова аб стварэньні аб'яднаных камітэтаў з прадстаўнікоў кампартыі, камсамолу, рэвалюцыйнага саюзу былых франтавікоў, унітарнае канфэдэрацыі працы і міжрабпому для перамоў з мясцовымі арганізацыямі сацыялістычнае партыі і агульнаю (рэфармісцкаю) канфэдэрацыяю працы супярэчыла пастановам кангрэсу, накіраваным у першую чаргу да заваёвы мас на прадпрыёмствах зьнізу, прымаючы пад увагу, што новыя абставіны вымагаюць новай палітыкі. Дорыё піша, што паколькі разгалосьсі паміж ім і ЦК спрабавалі выкарыстаць усе нязгодныя з лініяй VI кангрэсу, ён лічыць неабходным прызнаць свае памылкі і адмежавацца ад правых ухілістаў, асабліва ў той момант, калі УсеКП прыходзіцца весьці барацьбу з правымі, а таксама і з трацкісцкімі элемэнтамі, перамагаючы цяжкасьці сацыялістычнага ўраду, калі неабходна падтрымаць нашу кампартыю ў яе барацьбе з правымі і апартуністамі. Заява Дорыё аб тым, што спробы буржуазнай і сацыялістычнай прэсы выкарыстаць разгалосьсі ў французкай кампартыі дарэмны, і што ніхто ніколі ня мае рацыі, ідучы супроць сваёй кампартыі, сустракаецца гучнымі воплескамі дэлегатаў.

ЗА ПЕРАГЛЯД АНГЕЛЬСКАЕ ПАЛІТЫКІ Ў АДНОСІНАХ СССР.

ЛЁНДАН, 19-3. Абмяркоўваючы пытаньне аб дачыненьнях паміж СССР, Англіяй і Злучанымі Штатамі, умерана кансэрватыўная «Дэйлі Экспрэс» піша: «Прэзыдэнт Паўночна Амэрыканскіх Злучаных Штатаў Гувэр прызнае вялікія магчымасьці СССР. Калі Злучаныя Штаты прызнаюць СССР, дык вынікам такога прызнаньня будзе недавычайнае разьвіцьцё гандлю паміж абедзьвюма краінамі.

Калі-ж Англія ня спыніць сваю сучасную палітыку ў адносіне да СССР, дык прыбыткі Злучаных Штатаў будуць атрымоўвацца імі за кошт ангельскіх стратаў.

Урад Бальдвіна павінен ужыць захады для перагляду палітыкі, якая завяла англа-савецкія дачыненьні ў тупік».

Паездка дэлегацыі ў СССР не падабаецца ангельскаму ўраду.

ЛЁНДАН, 11-III. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Адказваючы на зададзенае яму ў палаце вобшчын пытаньне, начальнік дэпартаманту марскога гандлю Хэкінг сказаў, што дэлегацыю ангельскае прамысловасьці, якая накіроўваецца ў СССР, ня будзе суправаджаць які-небудзь афіцыйны прадстаўнік дэпартаманту марскога гандлю".

ЯШЧЭ ПРЭТЭНДЭНТ НА ТРОН У КАБУЛЕ.

НАДЗІР-ХАН СУПРОЦЬ ХАБІБУЛЫХАНА.

ЛЁНДАН, 19-3. Агенцтва Рэйтэр паведамляе з Пешавару: «Надзір-хан паслаў ліст Хабібуле, у якім заяўляе, што Хабібула зрабіў памылку, агаласіўшы сябе падышахам, бо ён ня мае неабходных для гэтага якасьцей. Надзір-хан прапануе Хабібуле прыняць удзел у вырашэньні пытаньня аб кандыдаце на трон падышаха, заяўляючы, што ў выпадку адмовы Хабібулы, ён выкарыстае ўвесь свой уплыў для таго, каб падняць аўганскія пляменьні на барацьбу супроць Хабібулы».

У Саюзных Рэспубліках.

ПРАЭКТ НОВАГА ЗАКОНУ АБ АКЛАДНЫМ СТРАХАВАНЬНІ.

ПРАЭКТ БУДЗЕ АБМЯРКОВАН ШЫРОКІМІ МАСАМІ СЯЛЯН.

МАСКВА, 19-3. Савет Працы і Абароны заслухаў даклад т. Бруханава аб увядзеньні акладнога страхаваньня сельска-гаспадарчых культур ад неўраджаю. Дзяржстрах СССР распрацаваў праэкт страхаваньня сельска-гаспадарчых культур ад неўраджаю на аснове ўнівэрсальнае адказнасьці. Страхаваньне мяркуецца праводзіць у грашовай форме, аднак, пры гэтым зьявіцца магчымасьць некаторага павышэньня страхавое ўзнагароды, асабліва ў неўраджайныя гады. Што датычыць формаў страхавога забясьпячэньня, дык в прычыны таго, што ў паасобных раёнах СССР сярэдняя ўраджайнасьць значна вагаецца, Дзяржстрах прапануе падзяліць СССР на 3 паясы. У першым поясе сярэдняя норма забясьпячэньня будзе складаць 60 проц. да 3-га ўраджаю, у другім поясе—45 проц. і ў 3-м поясе—42,5 проц. Бедняцкія сялянскія гаспадаркі падлягаюць вызваленьню ад страхавых плацяжоў. Праэкт Дзяржстраху СССР ухвален Наркамфінам СССР, дакладна абмяркоўваўся ў савнаркомах саюзных рэспублік і быў прызнан здавальняючым і своечасовым. Даклад выклікаў жвавы абмен думкамі. Выступаўшыя ў спрэчках аднадушна прызналі правільнымі асноўныя прынцыпы прапанаванага закону. Тав. Рыкаў, адзначаючы вялізнае значэньне ўвядзеньне абавязковага страхаваньня сельска-гаспадарчых культур на далейшае разьвіцьцё сялянскае гаспадаркі, прапанаваў праэкт закону папярэдня паставіць на шырокае абмеркаваньне друку і на мясцох. Такое абмеркаваньне зможа гарантаваць ад магчымых памылак, бо ўсе дэталі гэтага закону будуць усебакова і дакладна абмеркаваны на мясцох, пры ўдзеле прадстаўнікоў ад сялянства. Савет Працы і Абароны прыняў гэтую прапанову тав. Рыкава і ўтварыў камісію, якой даручыў арганізаваць шырокае абмеркаваньне праэкту, а потым падаць праэкт пастановы на разгляд СНК СССР.

ВЫРАБ ШТУЧНАГА ШОЎКУ Ў СССР.

МАСКВА, 19-3. СНК СССР зацьвердзіў дагавор паміж шоўкавым трэстам і «Могволокнострэем» з аднаго боку і нямецкай фірмай «Оскар Кагори і к-о»—з другога аб аказаньні фірмай тэхнічнае дапамогі пры пабудове і пуску ў СССР дзьвюх фабрык штучнага шоўку. Абодвы дагаворы падпісаны на пяць год.

Фірма складае эскізы і канчатковы тэхналёгічны праэкты фабрык, дае кансультацыю, перадае ліцэнзіі на ўсе маючыяся ў яе патэнты, рацэпты вырабу і інш.

Фірма навучае пэрсанал шоўкавага трэсту і «Могволокнострэя» усім стадыям вырабу штучнага шоўку на сваіх прадпрыёмствах у Нямеччыне, а таксама канструктуе на фабрыках шоўкатрэсту і «Могволокнострэя» савецкіх рабочых і тэхнікаў, камандыруючы для гэтае мэты сваіх спэцыялістаў.

Фабрыка шоўкатрэсту будзе будавацца ў Крыме, а «Могволокнострэй» у гор. Магілеве (на Дняпры).

Ленінградзкі порт перад навігацыяй.

ЛЕНІНГРАД, 19-3. «Совторгфлотам» распрацован плян параходных рэйсаў паміж Ленінградам і партамі Эўропы ў навігацыю 1929 г. Адчыняюцца тэрміновыя тавара-пасажырскія лініі. Ленінград—Лёндан, з заходам у Гуль (адыход в Ленінграду па серадам), Ленінград—Гамбург (адыход па чацьвяргох) і таварная лінія Ленінград—Стакгольм (кожныя 10 дзён). Апрача таго будуць працаваць рэгулярныя лініі Ленінград—Гамбург, Ленінград—Гаўр і Балтыцка--Чарнаморская лінія (кожныя два тыдні) в заходам у падарожныя парты Заходняй і Паўднёвай Эўропы і Паўночнае Афрыкі.

Рэкордная праца Волхаўстрою.

ЛЕНІНГРАД, 19-3. Праца Волхаўскае гідрастанцыі за апошнія паўгода зьяўляецца рэкордная. Замест 97 міліёнаў кілёват-гадзін па плану, станцыя выпрацавала 175 міліёнаў. Гадавое заданьне будзе выканана з перавышэньнем на 30 проц. З прычыны такой рэкордная працы станцыі сабекошт аднае кілёват-гадзіны 2,2 кап. зьніжана да 1,6 кап. Пры гэтым у працягу віновага часу пэрыядычна былі ў рамонце дзьве машыны, так што фактычна працавалі толькі 6 машын.

1-ы атрад інжынэраў для савгасаў.

ЛЕНІНГРАД, 19-3. 17-га сакавіка ў Палітэхнічным Інстытуце імя Калініна адбыўся ўрачысты выпуск 1-га атраду інжынэраў для савецкіх вернавых фабрык. Усяго выпушчана 11 інжынэраў, якія пакінуты пад загадам Зернатрэсту. Выпушчаныя інжынэры камандыруюцца ў Крым, Каўказ, Уладыкаўказ і інш. райёны. З прычыны выпуску атрымана шмат прывітаньняў з усіх канцоў СССР.

Новы турэцкі пасол у Маскве.

МАСКВА, 19-3. У Маскву прыбыў новы турэцкі надзвычайны і паўнамоцны пасол у СССР пан Хусэйн-Рагіб-бэй.

Выключэньне 10 трацкістаў з партыі.

САРАТАЎ, 19-3. Другім райкомам саратаўскае партарганізацыі выключаны з партыі 10 трацкістаў за контр-рэвалюцыйную дзейнасьць сярод рабочых саратаўскага трамвайнага парку. Усе яны пасьля 15-га зьезду партыі былі выключаны, але потым падалі заяву аб «пакаяньні» і былі адноўлены. Ня гледзячы на гэта яны ня спынілі сваёй анты-партыйнай дзейнасьці і, заканспіраціўшыся, ня спынялі распаўсюджваць сярод рабочых трацкісцкія лістоўкі і брашуры, агітавалі супроць пазык. Спрабавалі сарваць калдагаворную кампанію і нават наладзіць забастоўку. Агульны сход ячэйкі трамвайшчыкаў адназгодна ўхваліў пастанову райкому.

Курсы для жанчын, абраных у саветы.

МАСКВА. Саюзны СНК прапанаваў НКФ СССР адпусьціць в рэзэрвовага фонду СНК СССР 300000 руб. на арганізацыю курсаў для жанчын, абраных у саветы, і на культурна-бытавыя мерапрыёмствы па далейшаму вызваленьню жанчын культурна-адсталых народнасьцей.

Паводка ў Крыме.

СІМФЭРОПАЛЬ, 19-3. Пасьля 2-х дзён вялікага сьнегападу, зноў пацяплела, сьнег хутка тае. У Джанкойскім раёне паводка ня спыняецца. Некалькі вёсак заліты вадою. Размыта ў некалькіх мясцох чыгуначная калёіна Джанкой—Армянск і некалькі мастоў. Пацярпеўшым вёскам пасланa дапамога фуражом, харчамі і рабочай сілай.

Далучэньне Турцыі да маскоўскага пратаколу непакоіць Румынію.

ВЕНА, 19-3. Як паведамляюць з Бухарэсту, афіцыйная «Нацыён Румэн» абмяркоўвае перамовы ў артыкуле «Далучэньне Турцыі да маскоўскага пратаколу». Газэта піша; «У метах утрываленьня міру ў ўсходняй Эўропе Румынія зацікаўлена ў тым, каб мець на сваім баку Турцыю, якая падтрымлівала шчыльную прыяцельскую сувязь з Савецкім Саюзам». Зазначаючы далей на магчымасьць і жаданьне разьвіцьця румынска-турэцкіх эканамічных дачыненьняў, газэта выказвае ўпэўненасьць у тым, што Турцыя таксама зацікаўлена ў умацаваньні эканамічных дачыненьняў з Румыніяй. „Румынія,—піша газэта,—магла-б быць добрым рынкам для збыту турэцкіх тавараў, а Турцыя спрыяючым рынкам для румынскае нафты. У межах надыходзячага агульнага пагоджаньня гандлёвых дачыненьняў Румыніі в іншымі краінамі, Турцыя будзе аднэй в першых краін, з якімі ўрад Маніу падпіша канвэнцыю».

ЗГОДА АБ БАНКУ ПА РЭПАРАЦЫЯХ.

ПАРЫЖ, 19-3. У камісіі экспэртаў (па перагляду рэпарацый) дасягнута амаль поўная згода па пытаньні аб банку міжнародных разрахункаў. Мяркуючы па паведамленьнях парыскіх газэт, асноўны капітал банку будзе параўнаўча невялікім, дасягаючы «усяго» 100 міліёнаў даляраў; банк будзе зьвязан з эмісійнымі банкамі асобных краін; апрача таго, у арганізацыі яго будуць удзельнічаць буйнейшыя прыватныя банкі. Ён будзе рэгуляваць рэпарацыйныя аддачы натурай, але разьмеры гэтых паставак будуць паступова скарачацца, а ўзамен таго будуць павышацца разьмеры грашовых плацяжоў. Гэта згода дасягнута, у выніку перамоў в ангельскім міністрам фінансаў Чэрчылем, які прыяжджаў на нядзелю ў Парыж.

УСІМ АКРУГКОМАМ КП(б)Б.

Дарагія таварышы!

ЦК УсеКП(б) распачынае абсьледаваньне працы Кампартыі Беларусі. Абсьледаваньне, даручанае адказнаму інструктару ЦК УсеКП(б) тав. Карыбу, ахопіць вузлавыя моманты ўсёй нашай працы за апошнія некалькі год у галіне росту нашай народнай гаспадаркі, росту сацыялістычнага сэктару яе, разгортваньня культурнае рэвалюцыі, правядзеньня ленінскае нацпалітыкі, колькаснага і якаснага росту партыі, унутранага партстановішча і наколькі ўся КП(б)Б выразна і правільна праводзіць лінію XV-га зьезду і чарговых пастаноў УсеКП(б) у жыцьцё з улічэньнем абставін Беларусі.

Гэта абсьледаваньне павінна прыцягнуць да сябе ўвагу ўсёй КП(б)Б; пагэтаму ЦК КП(б)Б зьвяртаецца да вас з прапановаю аказаць максымальную дапамогу гэтаму абсьледаваньню, прыцягнуць партыйныя масы да актыўнага ўдзелу ў ім і рашучай самакрытыкай, самаправеркай выявіць як усе недахопы, слабыя месцы, так і вопыт усёй станоўчай працы.

Абсьледаваньне нашай працы з боку ЦК пры актыўным нашым удзеле ў ім і дапамозе яму значна дапаможа палепшаньню нашай далейшай працы.

ЦК КП(б)Б.

ЯПОНІЯ ГАСПАДАРЫЦЬ У КІТАІ.

ШАНХАЙ, 18-3. Японскія маракі ў Ханькоу цяжка паранілі старшыню анты-японская стачачнага камітэту Ля-Ю-Юэня. Упаўнаважаны па замежных справах заявіў пратэст японскаму консулу.

Як паведамляе агенцтва Тохо, японскія купцы ў Ханькоу пачалі экспартаваць тавары, якія псуюцца, ня гледзячы на байкот.

Дастаўка тавараў на параходы вядзецца пад аховай японскіх марскіх сіл. Агенцтва Тохо паведамляе, што калі кітайцы будуць перашкаджаць экспарту і пагражаць грузчыкам, дык японскі флёт ужыве „неабходныя захады».

* * *

ХАРБІН, 19-III. У Дайрэне сабралася шмат японскага войска. Частка яго расквацёравана ў прыватных кватэрах.

ГАМІНДАН І ЛІГА НАЦЫЙ

ШАНХАЙ, 18-3. На зьезьдзе Гаміндану паступіла прапанова кітайскага пасланьніка ў Бэрліне Чжан-Цзо-піна вызначыць адносіны Гаміндану да Лігі Нацый. Чжан-Цзо-пін заявіў, што калі па думцы нанкінскага ўраду, Ліга Нацый ня ставіць сваёй мэтай абарону справядлівасьці і зьяўляецца толькі зброяй вялікіх дзяржаў у барацьбе з малымі і слабымі нацыямі, дык ня трэба спыняцца перад выхадам з Лігі. У адваротным выпадку неабходна выпрацаваць пэўную палітыку ў адносіне да Лігі Нацый, назначыць сваіх дэлегатаў у Лігу і спрабаваць вярнуць Кітаю месца ў радзе Лігі.

Паўстанцкія атрады ня спыняюць дзейнасьці.

ШАНХАЙ, 18-3. Як паведамляе агенцтва Тачун, паўстанцкія атрады пад кіраўніцтвам Чу-дэ і Мао-Цзэ-туна перайшлі граніцу Цзянсі і ўвайшлі ў правінцыю Фуцзян. У сучасны момант гэтыя атрады знаходзяцца ў паўднёвым Фуцзяне ля мяжы з Гуандунем. Нанкінскі ўрад пасылае супроць гэтых атрадаў карную экспэдыцыю.

СЁМЫ МЕСЯЦ ЗАБАСТОЎКІ ФРАНЦУСКІХ ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ.

Сутычкі з паліцыяй.

ПАРЫЖ, 19-3. У Алюэне, дзе ўжо 7-мы месяц цягнецца забастоўка тэкстыльшчыкаў, за апошнія дні адбыўся шэраг сутычак паміж бастуючымі і паліцыяй. Як вядома муніцыпалітэт Алюэна, кіруемы камуністамі, выдаў абавязковую пастанову, забараняючую паліцыі разганяць бастуючых, якія зьбіраюцца на тратуварах. Начальнік паліцыі, ня гледзячы на гэта, загадаў разганяць зьбіраючыхся на тратуварах дэманстрантаў. У адказ на гэта каля 1000 бастуючых наладзілі дэманстрацыю пратэсту, якая таксама была разагнана. Учора кіраўнік Алюэнскіх штрайкбрэхераў зрабіў замах на жыцьцё маладога партыйнага стачачніка, цяжка параніўшы яго.

„Сацыяліст" Поль Бонкур бароніць езуітаў

ПАРЫЖ, 19-3. Агенцтва Гавас паведамляе: «Пры абмеркаваньні ў палаце дэпутатаў пытаньня аб рэлігійных кангрэгацыях, старшыня камісіі па замежных справах Поль Банкур заявіў, што камісія кіравалася выключна мерканваньнямі замежнае палітыкі і адхіляла ўсякія спробы сабатаваць данае пытаньне. Дакладчык камісіі Эро адзначыў працу місіянэраў, якая ажыцьцяўляецца ў згодзе з сьвецкім законадаўствам, а таксама ў згодзе з „вышэйшым законам, г. зн. законам велічы Францыі". Водпуг даных дакладчыка, рэлігійныя місіі навучаюць 500 тысяч выхаванцаў, маючы ўсяго 7 міліёнаў франкаў субсідыі, у той час, як сьвецкія місіі, якія навучаюць 10 тыс. выхаванцаў маюць 34 міліёны франкаў субсідый. Адзначыўшы, што Італія і Паўночна-Амэрыканскія Злучаныя Штаты субсідуюць свае рэлігійныя місіі, Эро прапанаваў палаце зацьвердзіць артыкулы аб рэлігійным кангрэгацыях".

Страх перад камуністычнай прапагандай

РЫГА, 18-3. У Латвійскім акруговым судзе разглядалася справа па абвінавачаньні ў камуністычнай прапагандзе і ў рэвалюцыйнай дзейнасьці Бэрвіна, Кугіена і 2-х жанчын. Бэрвін, ранейшы намесьнік НК Земляробства Савецкае Латвіі прысуджан да 5 год прымусовых работ. Рэшта абвінавачаных да 3-х год крэпасьці кожны.

Яшчэ адна змова пад апякунствам Англіі.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 17-3. З Бэйруту паведамляюць, што ў Іцдыі адбывалася нарада членаў скінутае пэрсыдзкае дынастыі Каджараў, на якой абмяркоўвалася пытаньне аб звароце трону ранейшаму хану. Ранейшы хан жыве ў Хайфе на ўтрыманьні ангельцаў.

Сірыя проці Францыі.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 19-3. Водпуг паведамленьняў з Алеппо, у Сірыі ўсюды адбываюцца дэманстрацыі супроць французкае ўлады.

Сьмерць Фоша.

ПАРЫЖ, 20-3. Памёр маршал Фош.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Масавыя арышты моладзі ў Кракаве.

ВАРШАВА, 16-3. У Кракаве адбыліся масавыя арышты моладзі. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да камсамолу.

Мабілізацыя запасных.

КОЎНЯ, 19-3. Афіцыёз «Летувос Айдас» паведамляе, што ў працягу апошніх тыдняў польская вайсковая ўлада мабілізуе запасных у Віленшчыне, а таксама ў райёне польска-нямецкае граніцы. Праводзілася таксама праверка падлягаючага мабілізацыі коннага складу ў Віленскім, Гарадзенскім і Сувальскім паветах. Усе гэтыя меры ажыцьцяўляюцца, водпуг слоў газэты, у вялікай тайне.

Забастоўка трамвайшчыкаў.

У Заглебе Дамброўскім 14-га сакавіка пачалася забастоўка рабочых трамваю на грунце зарплаты. Рабочыя патрабавалі павышэньня месячнае зарплаты на 25 зл. у месяц. Адміністрацыя ўжо згаджалася павысіць зарплату на 8-10 проц. У зьвязку з забастоўкай трамвайны рух у горадзе спыніўся. Курсыравалі некаторыя вагоны, якія вяді кантралёры.

Голад у Латгаліі.

РЫГА, 17-3. Водпуг вестак, у Латгаліі ўжо цяпер галадуе ня менш 70 проц. сельскага насельніцтва. Характэрны адносіны да гэтага пытаньня некаторых членаў латвійскага ўраду. Я. напрыклад, міністр працы Рубуліс (лідэр латгальскіх, г. зн. «дэмакратычных» хрыстыян) на пасяджэньні каліцы заявіў, што голаду ніадзе няма, і таму ўсе гутаркі аб голадзе не абгрунтаваны. Урадавая кавалькада ўстрывожана ўтварыўшымся ў Латгаліі становішчам. Гаворыць аб тым, што ўрад зьбіраецца асыгнаваць каля 9 міліёнаў лат на барацьбу з голадам.

УЗМАЦНІМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

ПАСТАНОВА
САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
пра ўвядзеньне абавязковых для землякарыстальнікаў агрыкультурных палепшаньняў у сельскай гаспадарцы.

Для больш шырокага ўвядзеньня ў сельскай гаспадарцы масавых агрыкультурных палепшаньняў, накіраваных на павялічэньне прадукцыйнасьці і тэхнічнага ўзроўню сельскай гаспадаркі БССР, асабліва для паслядоўнага ўраджайнасьці, Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць сельска-гаспадарчыя камуны, арцелі і саўгасы гаспадаркі ўвесьці пачынаючы з 1928-29 году, наступныя агрыкультурныя палепшаньні:

а) ачышчэньне насеньня;

б) пратручваньне насеньня для зьнішчэньня галаўні;

в) узворваньне на зяб пад яравыя культуры: авёс, ячмень, бульбу і кораньплёды;

г) абкошваньне да часу красаваньня пустазельля палявых дарог, канаў і межаў;

д) забарону пасьвіць жывёлу на сенажацях раньняю вясною і позьняю восенью і ва ўсякі час на азімых пасевах. Тэрміны забароны пашы на сенажацях устанаўляюцца райённымі выканаўчымі камітэтамі;

е) зьнішчэньне хмызьняку і куп'я на сенажацях;

ж) баранаваньне лугоў;

з) пасадку пладовых дрэў у рады з адлегласьцю паміж дрэвамі ня менш 8 мэтраў для яблынь і груш і ня менш 4 мэтраў для костачкавых парод: сьліў, вішань і чарэшань;

і) мерапрыёмствы для догляду за садам праз ачыстку і пабелку стваловаў, аколіцы прыстваловых кругоў, зьбіраньне і зьнішчэньне сухога лісьця і пладоў, што зімуюць на дрэвах, зьбіраньне ападнаў на працягу ўсяго лета;

к) трохпалёвы пладазьмен у агародах;

л) зьбіраньне ў часе ўборкі гароду рэшткаў расьлін: качаноў, лісьця, сьцебляў і г. д.;

м) зьбіраньне, захаваньне і скарыстаньне попелу на ўгнаеньне;

н) ўмываньне шматпалёвага севазвароту;

о) спуск вады з палёў.

2. Даць райённым выканаўчым камітэтам права абавязваць паселкі і таварыствы грамадзкай апрацоўкі зямлі ўводзіць наступныя агрыкультурныя палепшаньні:

а) ачышчэньне насеньня;

б) пратручваньне насеньня для зьнішчэньня галаўні;

в) узворваньне на зяб пад яравыя культуры: авёс, ячмень, бульбу і кораньплёды;

г) абкошваньне да часу красаваньня пустазельля палявых дарог, канаў і межаў;

д) забарону пасьвіць жывёлу на сенажацях раньняю вясною і позьняю восенью і ва ўсякі час на азімых пасевах. Тэрміны забароны пашы на сенажацях устанаўляюцца райённымі выканаўчымі камітэтамі;

е) зьнішчэньне хмызьняку і куп'я на сенажацях;

ж) баранаваньне лугоў;

з) пасадку пладовых дрэў у рады з адлегласьцю паміж дрэвамі ня менш 8 мэтраў для яблынь і груш і ня менш 4 мэтраў для костачкавых парод: сьліў, вішань і чарэшань;

і) мерапрыёмствы для догляду за садам праз ачыстку і пабелку стваловаў, аколіцы прыстваловых кругоў, зьбіраньне і зьнішчэньне сухога лісьця і пладоў, што зімуюць на дрэвах, зьбіраньне ападнаў на працягу ўсяго лета (для пасёлкаў);

з) зьбіраньне, захаваньне і скарыстаньне попелу на ўгнаеньне;

і) грамадзкі шматпалёвы севазвавот, на які пастанова аб гэтым будзе прынята большасьцю галасоў сходу пасёлку;

к) пасеў гатункоўным насеньнем толькі цэлымі палямі;

л) спуск вады з палёў;

м) зьнішчэньне куп'я і хмызьняку.

Пастановы аб абавязковым увядзеньні агрыкультурных палепшаньняў пасёлкамі і таварыствамі грамадзкай апрацоўкі зямлі павінны прымацца райённымі выканаўчымі камітэтамі пасьля папярэдняга абмеркаваньня іх на сельска-гаспадарчых канферэнцыях сельскіх саветаў, на пленумах сельскіх саветаў і ў райённых сельска-гаспадарчых саветах.

3. Даць райённым выканаўчым камітэтам права абавязваць усе гаспадаркі раёну ўводзіць наступныя агрыкультурныя палепшаньні:

а) ачышчэньне насеньня;

б) пратручваньне насеньня, заражанага галаўнёю;

в) абкошваньне да часу красаваньня пустазельля межаў, палявых дарог і канаў;

г) забарону пасьвіць жывёлу на сенажацях раньняю вясною і позьняю восенью і на ўсякі час на азімых пасевах. Тэрміны забароны пашы на сенажацях устанаўляюцца райённымі выканаўчымі камітэтамі;

д) забарону выпускаць сьвіней на сенажацях;

е) зьбіраньне, захаваньне і скарыстаньне попелу на ўгнаеньне;

ж) зьнішчэньне хмызьняку і куп'я на сенажацях;

з) спуск вады з палёў.

Пастановы пра абавязковае ўвядзеньне агрыкультурных палепшаньняў усімі гаспадаркамі райёну павінны прымацца райённымі выканаўчымі камітэтамі пасьля папярэдняга абмеркаваньня іх на пленумах сельскіх саветаў і райённых выканаўчых камітэтаў і ажыцьцяўляцца пасьля зацьверджаньня акруговым выканаўчым камітэтам.

4. За неправядзеньне абавязковых агрыкультурных палепшаньняў устанаўляюцца наступныя пакараньні:

А. ДЛЯ КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК (КАМУН, АРЦЕЛЯЎ І ТАВАРЫСТВАЎ) ГРАМАДЗКАЙ АПРАЦОЎКІ ЗЯМЛІ:

а) скарачэньне, паводле пастановы акруговага выканаўчага камітэту, сельска-гаспадарчага крэдытаваньня;

б) штраф да 100 рублёў;

в) пазбаўленьне правоў на атрыманьне пахвальных і грашовых прэмій на сельска-гаспадарчых выстаўках і конкурсах.

Б. ДЛЯ ЎСІХ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ГАСПАДАРАК:

а) скарачэньне сельска-гаспадарчага крэдытаваньня;

б) штраф да 50 рублёў;

в) пазбаўленьне права на атрыманьне пахвальных і грашовых прэмій на сельска-гаспадарчых выстаўках і конкурсах.

5. За сыстэматычнае наўмыснае неправядзеньне абавязковых агрыкультурных палепшаньняў, вінаватыя прыцягваюцца да судовай адказнасьці.

6. За неправядзеньне агрыкультурных палепшаньняў абавязковых для савецкіх гаспадарак, загадчык савецкай гаспадарні прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасьці.

7. Кантроль за правядзеньнем землякарыстальнікамі абавязковых агрыкультурных палепшаньняў усклядаецца на райённыя выканаўчыя камітэты і сельскія саветы.

8. Райённыя выканаўчыя камітэты павінны ўжыць усе захады для шырокай папулярызацыі абавязковых агрыкультурных палепшаньняў сярод насельніцтва і для ўздыму актыўнасьці сялянства ў гэтай справе.

9. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства на працягу двух тыдняў распрацаваць тэхнічную інструкцыю пра ажыцьцяўленьне гэтай пастановы, уцягнуўшы ў гэтую працу работнікаў Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна, Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, і дасьледчых устаноў Народнага Камісарыяту Земляробства.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Знаменнічай Нарады БССР А. ДУБАВІЦКІ.

19 сакавіка 1929 г.
г. Менск.

„Савецкая Беларусь" у паходзе за ўраджай
КУЛЬТУРУ І ВЕДЫ---У ВЁСКУ.
(ВЁСКА ГАРОЧЫЦЫ, НА МАЗЫРШЧЫНЕ).

Прыезд рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» з друкарняй і кіно ў вёску Гарочыцы абярнуўся ў сапраўднае сьвята. Кожны дзень школа поўна народу і ня толькі мясцовых сялян і рабочых, але прыходзяць сяляне за 15-20 вёрст каб пачуць, што кажуць прадстаўнікі Менску, расказаць ім сваё гора і радасьць і пабачыць друкарню. На ўсіх тварах сьвяточная радасьць. Ды як-жа ня радавацца, калі тут табе ўсё: і аграном, і судзьдзя, і ўсё тое, што так пільна трэба селяніну. Рэдактар аглядавай газэты т. Паўлоўскі, сэкратар рэдакцыі тав. «Ганулька» (так завуць жанчыну-сэкратара ў Гарочыцах) і нам. рэдактара тав. Касьцюк ад раньня і да позьняй ночы даюць адказы і парады сялянам.

Допісы ў рэдакцыю сыплюцца з усіх бакоў. Першы нумар газэты ўжо вышаў і распаўсюджан па сельсавеце. Праежджыя сяляне заяжджаюць у рэдакцыю і атрымоўваюць адказы на ўсе пытаньні.

У вёсцы Гарочыцы праведзена некалькі афіцыйных агульных сходаў, а неафіцыйныя адбываюцца кожны дзень. Многа вырашана вясковых пытаньняў за некалькі дзён. Уся праца на вёсцы ішла як спраўны гадзіньнік. Калі раней бывала лясьнічы ці хто іншы ў службовы час папівае гарбату, а селянін мерзьне пад дзьвярыма, дык зараз аб гэтым і паміну няма.

Зернаачышчэньне на вёсцы, якое пасоўвалася раней чарапашым крокам, зараз ідзе з асаблівай напружанасьцю. На зернаачышчальным пункце—завоз, і машына мае поўную нагрузку. Калгасы «Савецкая Беларусь» і «Чырвонае Знамя» рыхтуюцца да веснавой пасеўкампаніі: складаюцца вытворчыя пляны, падлічваецца ўсё неабходнае да вясны. Калгасьнікі, асабліва «Савецкая Беларусь», зрабілі заяўку на насеньне сельска-гаспадарчаму крэдытнаму т-ву і пачысьцілі сваё насеньне. Акрза і РЗК, якія і ня думалі аб земляўпарадкаваньні калгасаў, ужо рыхтуюцца да земляўпарадкаваньня калгасаў зараз-жа, як толькі зьедзе сьнег. Сяляне ўзяліся за попел і ўжо некаторыя, нават, з лесу вязяць попел дадому.

Два тыдні таму назад Калінкавіцкі РВК яшчэ спрачаўся адносна рамонту Гарочыцкай школы, а зараз ужо абяцае адпусьціць 1500 р. Вёска Гарочыцы налічвае 260 двароў, а няма хаты-чытальні. Зараз, дзякуючы выязной рэдакцыі, у школе адчыняецца «Чырвоны куток». Ужо ёсьць трохі літаратуры—адпусьціў акруговы інспэктар Палітасьветы на 30 руб. ды сяляне за самаабкладаньне купяць на 50 руб.

Нельга апісаць той урачыстасьці, той радасьці сялянства, той вялізарнай працы, якую ўжо зрабіла рэдакцыя. Выязная рэдакцыя «Савецкай Беларусі» супольна з парт'ячэйкай, камсамолам, калгаснікамі, вясковым актывам і настаўніцтвам сеюць у в. Гарочыцы і ва ўсім Зеляноцкім сельсавеце культуру і веды.

В. ЛЯВОНІК.

З ДРУКАРНЯЙ У ВЕСЦЫ.
(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

— Кажаце, з друкарняй?

— Так, так, з друкарняй і кіно.

— У вёску?

— Канешне, у вёску, у глухую Мазырскую вёску, праводзіць агляд.

— Агляд работы сельсавету?

— Не. Агляд усяе работы і асабліва падрыхтоўкі да сяўбы.

Такія дыялёгі адбываліся ў Мазыры, у Калінкавічах. Ня могуць уцяміць людзі, чаго так „расщедрилась",—як мне казалі, рэдакцыя.

Наш прыезд выклікаў ажыўленыя спрэчкі і гутаркі па ўсёй акрузе.

— Няўжо з прычыны пасеўкампаніі?

— Не, тут нешта ёсьць!..

Напрывычна неяк для мазырчан, калінкавічан такое зьявішча.

— Каб столькі людзей, з такімі прыладамі ды ў вёску!

— Столькі грошай!?

Пачынялі абмяркоўваць. Доўга, гадзінамі.

Нарэшце, абяцалі дапамогу.

У акрузе—аграном, у раёне—пракурора і таксама агранома. Наперадзе дні ў вёсцы, работа, а цяпер задаволенасьць, што дапамога будзе.

ПА ВЁСКАХ.

Яшчэ больш дзіву даліся сяляне.

— Да нас, сюды вось, у наш глухі куток?..

— А ці прыедзе аграном—умешваецца ў гутарку пажылы дзядзька?

— Будзе, канешне прыедзе.

— То добра. Яшчэ ў жыцьці сваім ня бачыў агранома. Кажуць людзі, пасобіць ён многа, а я і ня ведаю.

— Няўжо ў вас аграном ня быў?

— Не, ніколі ня бачылі! Прыяжджалі агенты, аратары, а вось агранома ня бачылі.

Так нам апавядалі сяляне з Гарочыц, з Зеляноч.

Чаго—думалася—варта такая работа? Ніколі ня быў аграном! А колькі часу прышлося патраціць на тое, каб яшчэ ў Калінкавіцкім РВК упэўніць старшыню, што аграном павінен сюды выехаць.

— Не дамо—казалі—заняты.

— Дык ён і ў нас будзе працаваць.

— Не, ня можам, цяпер пасеўная кампанія.

Вось які погляд у райвыканкомаўцаў з Калінкавіч. Раз пасеўкампанія, значыць, аграном будзе заняты.

— Дзе-ж і чым заняты?

— Даклады піша.

— Так і сказалі, бяз сораму. „Даклады піша" і ўсё. Ці-ж гэта не работа?! А вось тут у вёсцы ніколі агранома, за ўсё жыцьцё, ня бачылі. Ці паставіш у такім выпадку пытаньне канкрэтна—як павялічыць ураджай, што трэба зрабіць, каб сельская гаспадарка давала больш прыбытку.

ТРЫЕР ГУДЗІЦЬ, АЛЕ З ПЕРАПЫНКАМІ.

Як толькі прыехалі ў вёску, зацікавіліся ходам падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі. У першыя дні выявілася, што трыер скарыстоўваўся няпоўнасьцю. Адзін трыер на 900 з лішнім двароў—ня ўвесь час быў у рабоце. У дзьвёх вёсках трыер «прагуляў» па некалькі дзён. Гэта ня дзіва, бо нават члены сельсавету ня былі азнаёмлены з плянам падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Толькі 9-га сакавіка на пленуме сельсавету разглядаўся і зацьвярджаўся плян пасеўкампаніі па Зеляноцкаму сельсавету.

Запытайцеся ў сельсаветчыкаў аб прычынах такога спазьненьня, і, канешне, знойдзецца «агаворачка», вонкавыя акалічнасьці» і г. д.

Выключэньнем зьяўляецца толькі сэкратар сельсавету.

Напомніце яму аб спазьненьні з плянамі, і ён, задзіраючы галаву, будзе ўпэўнена казаць:

— Пляны? Спазьненьне? Глупства. Што даюць пляны? Валакіта. Бюракратызм. Гим... пляны. Дагэтуль пам здарылася спатыкаць людзей, якія пляны ставілі на першым месцы, а Хадзькоў прыцыпова супроць плянаў. Знайшлі чым занімацца, плянамі!

Мабыць, з гэтае-ж прычыны т. Хадзькоў плян, які ім, як тэхнічным сэкратаром ячэйкі КП(б)Б, быў атрыман з райкому 26-га студзеня, у бюро перадаў толькі 9-га сакавіка. Паўтара месяцы т. Хадзькоў «марынаваў» рэзалюцыі і плян райкому па такому важнаму пытаньню, як пасеўкампанія. Далей ісьці няма куды. Ніякія агаворкі, што „я супроць пляну" не дапамогуць. Тав. Хадзькоў павінен за такое нядбайства панесьці поўную адказнасьць.

ХАДАКІ.

Наладзілі друкарню, пусьцілі два фільмы—«Лясная быль» і «Вір», правялі некалькі сходаў, і лёд недавер'я, баязьні ломнуў.

Спачатку, праўда, было ніякавата. заходзілі, аглядаючыся, гаварылі паціху, нясьмела, баючыся. Але пасьля таго, як з боку рэдакцыйных працаўнікоў быў дан першы і другі бой кулацтву, беднота падняла галаву, пачала гаварыць сьмялей, больш стала выкрываць факты злачынства.

За тыдзень праз рэдакцыю прайшло больш 100 чалавек, якія скардзіліся на недахопы ў мясцовым і райённым апараце і на асобных працаўнікоў гэтага апарату. Пададзена больш 100 заметак. Каля тысячы чалавек прайшло праз друкарню, дзе тлумачыліся ўсе працэсы работы.

Праходзілі маладыя, дарослыя, пажылыя і старыя. Закраналіся рознахарактэрныя пытаньні. Адказваць цяжка, часта не пад сілу. А аграном і пракурор ня едуць. Заглянуў, праўда, на дзень два аграном з Калінкавіч; ня мог ён задаволіць усіх запатрабаваньняў.

Па сходзе ў Гарочыцах пытаньні ня спыняліся далёка за поўнач. У Зеляноча актыўнасьць прыняла канкрэтную форму: сяляне запатрабавалі адчыненьня ільнаволнага таварыства.

— Годзе нам па начох сядзець за кудзеляю, машыну трэба—казалі кабеткі і дзяўчаткі.

ДВА ПЕРШЫЯ.

Матар'ял у газэту зьбіраўся хутка. За дзень—другі на стале вырасталі папяровыя горкі. На кавалачку заму соленае паперкі нязграбнымі літарамі выводзіліся хвалюючыя сяляні думкі: пра ўраджай, пра неабходнасьць больш пашырыць культурную працу, пра факты злачынства.

Ужо з падшліфаванымі думкамі бедняка і серадняка вышаў першы, а праз тры дні—і другі нумары нашай аглядавай газэты.

Газэта разьмяркоўвалася дармова на кожную сялянскую хату. Усяго 1000 экземпляраў.

Асаблівае месца ў нашай працы заняў нова арганізаваны **калгас імя газэты «Савецкая Беларусь»**. Першымі адгукнуліся калгасьнікі на заклік аб тым, каб абсталяваць чырвоны куток. Але аб калгасе імя газэты «Савецкая Беларусь» у другі раз.

Янка Паўлоўскі.

Гарочыцы, 18 сакавіка.

Пара перайсьці ад слоў да справы.
(ДА УВАГІ ПРАФСАЮЗАЎ).

Аб важнасьці пасьняховага правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі ўжо многа пісалася ў нашым друку. Досыць сказаць толькі тое, што затрыманьне тэмпу разьвіцьця зернавой гаспадаркі пры далейшым росьце насельніцтва можа прывесьці да велізарных бед, каб прасякнуцца важнасьцю пытаньня падняцьця сельскай гаспадаркі наогул і пасьняховага правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі ў прыватнасьці.

КПБ і ўрад БССР вызначылі шэраг практычных мерапрыемстваў для правядзеньня ў жыцьцё ў пасеўную кампанію г. г., як пашырэньне плошчы пасеву на 3 проц., падвышэньне ўраджайнасьці на 7 проц. і т. д.

Зразумела, што гэтыя мерапрыемствы магчыма будзе ажыцьцявіць толькі пры ўмове напружанай працы партыйных і савецкіх органаў на месцах, пры ўмове разьвіцьця сьвядомасьці і актыўнасьці беднацка-серадняцкіх груп сялянства, пры ўмове мабілізацыі ўвагі і арганізуючай ролі рабочае клясы ў правядзеньні пасеўнай кампаніі.

Прэзыдыум ЦСПСБ у сваей пастанове своечасова загострыў увагу ўсіх прафсаюзных арганізацый на пытаньні ўдзелу іх у правядзеньні вясеньняй пасеўной кампаніі, ён даў цэлы шэраг практычных паказаньняў на гэтаму пытаньню, але да жалю прыходзіцца канстатаваць, што шмат якія саюзы да апошняга часу яшчэ не прыступілі да практычнага ажыцьцяўленьня гэтых каштоўных дырэктыў.

Вось, напрыклад, ЦП саюзу скурнікаў нават не абгаварвала яшчэ пытаньня аб удзеле ў пасеўнай кампаніі.

ЦП саюзу харчавікоў распрацавала досыць каштоўны плян правядзеньня кампаніі, але гэты плян толькі сёньня будзе абгаварвацца на сходзе прафактыву. Тое самае амаль магчыма сказаць адносна саюзаў хімікаў і чыгуначнікаў: пытаньне абгаварвалася, але практычных вынікаў пакуль што няма.

Між тым справа не чакае, дераз некалькі тыдняў пачынаецца сяўба, а тагды ўжо позна будзе ажыцьцяўляць дырэктывы, выконваць пляны працы.

Вёска цяпер патрабуе арганізацыйных мерапрымстваў і дапамогі ў справе рамонту сельска-гаспадарчых машын, ачысткі насеньня, актывізацыі працы агранамічнай сеткі, прасоўваньня штучнага ўгнаеньня і г. д.

Прафэсыянальныя саюзы павінны тэрмінова прыступіць да выканеньня дырэктыў прэзыдыуму ЦСПСБ і рэалізацыі сваіх плянаў па правядзеньню вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Асаблівая ўвага вытворчых саюзаў павінна быць зьвернута на посылку ў вёску рабочых брыгад.

Таксама рабочыя брыгады дадуць і палітычны і вытворчы эфэкт. Рабочыя брыгады ўзмацняць нам нізавы апарат, дапамогуць правільнаму правядзеньню вызначаных партыяй і урадам мерапрыемств, узмоцняць саюз беднейшага і серадняцкага сялянства з рабочаю клясаю, дапамогуць арганізаваць адпор кулацкім, контрэвалюцыйным элементам, якія імкнуцца пашкодзіць пасьняховаму правядзеньню вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Разам з гэтым рабочыя брыгады дапамогуць арганізацыі тэхнічных мерапрыемств, як ачыстка насеньня, рамонт сельска-гаспадарчых машын і г. д.

Адначасова з пасылкаю рабочых брыгад у вёску неабходна разьвіваць пераклічку паміж асобнымі прадпрыемствамі і сёламі. Гэтая пераклічка павінна выявіць посьпехі і недахваты ў працы, стварыць вытворчыя спаборніцтвы паміж прамысловасьцю і сельскаю гаспадаркаю, паміж асобнымі прадпрыемствамі і сёламі.

Такія формы змычкі паміж горадам і вёскаю, як пасылка брыгад і вытворчая пераклічка неабходна скарыстаць чым хутчэй у справе падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Мацюкевіч.

АКРСЕЛЬСАЮЗ ЗРЫВАЕ КАНТРАКТАЦЫЮ.
(Талачынскі р., Арш. акр.).

Чынушы сядзяць у Аршанскім акрсельсаюзе. Яны нават ня ведаюць самі, што робяць.

18-I—29 г. Талочынскім Райза была атрымана адносіна ад акрсельсаюзу аб разьмеркаваньні плошчы кантрактацыі: ільна-валакна 275 гэктараў, бульбы 600 гэкт. і канюшыны 55 гэкт. паміж сельска-гаспадарчымі крэдытнымі таварыствамі райёну.

12-II пасяджэньнем пасеўнае пяцёркі з прысутнічаньнем старшыні крэдытных таварыстваў было разьмеркавана гэта заданьне па кантрактацыі.

Гэта пастанова ў той-жа дзень сьцешнай поштай была накіравана ў акрсельсаюз. Усе ўзяліся за працу. Але... як заўсёды і на гэты раз здарылася нешта ў акрсельсаюзе. Нейкі чыноўнік адным росчаркам пяра скасаваў гэту пастанову.

14-II Талочынскі Райза атрымлівае ад акрсельсаюзу ўжо іншае разьмеркаваньне па кантрактацыі: ільна-валакна 225 гэктараў, насеньня ільну 50 гэкт., бульбы 675 гэкт., канюшыны 55 гэкт., ячменю 50 гэкт. і гатункоўга аўсу 375 гэкт.

Зноў 16-II склікаецца пасяджэньне пяцёркі, зноў разьмяркоўваюць плошчу кантрактацыі паміж крэдытнымі таварыствамі і калгасамі. Але і на гэты раз прыступіць да працы ім нельга было. Крэдытнымі таварыствамі, за выключэньнем толькі Талочынскай, да гэтага часу не разьмеркавана вызначаная плошча па кантрактацыі паміж сельсаветамі, бо ад акрсельсаюзу няма належных інструкцый, палажэньняў наконт гэтага і нават умоў, без чаго нельга праводзіць кантрактацыю.

— Я сам ня ведаю колькі з дзесяціны натрэбна здаць селяніну,—важа райгранром Герасімаў, —прыходзіцца маўчаць, калі сяляне пытаюцца аб умовах кантрактацыі.

Дзякуючы гэтаму нічога ня зроблена для папулярызацыі карысьці кантрактацыі сярод насельніцтва. Цікава тое, што калі акрсельсаюз накіроўвае які-небудзь матар'ял наконт кантрактацыі, дык частка яго попадае ў Райза, а частка ў крэдытнае таварыства, у выніку чаго, калі прыходзіцца даць некаторыя весткі, дык адзін да другога ходзяць.

Гэтак акрсельсаюзаўскія чыноўнікі зрываюць кантрактацыю на Талочынчыне.

Селькор Х. З.

НЯДБАЙНІКІ І БЮРАКРАТЫ З БЕЛСЕЛЬСАЮЗУ.

Магілеў, 20-III. У блянках дагавораў і кнігах па кантрактацыі, якія надрукаваны Белсельсаюзам і разасланы праз акрсельсаюзы ў крэдытныя таварыствы, дапушчана шмат памылак, у тым ліку буйных (лічбовыя).

Зразумела, трэба іх справіць. І вось Белсельсаюз пасылае ў акрсаюзы па адным паасобніку пералік гэтых памылак, зробленых нібыта «на віне друкарні». Не дадумаліся нядбайнікі і валакітчыкі з Белсельсаюзу да таго, каб пералік гэтых памылак размножыць друкарскім спосабам, у ліку па колькасьці крэдытных таварыстваў.

А тымчасам кантрактацыйныя ўмовы ўжо складаюцца, і бядакі з крэдытных таварыстваў ламаюць галавы, разьбіраючыся ў формах Белсельсаюзу, —бо нічога ня ведаюць пра «віну друкарні», а пералік памылак да іх яшчэ не дайшоў.

Досыць спаць!
(Халопеніцкі р., Меншчына).

Вясна—на носе і сяўба не за гарамі. Аднак, аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасяўной кампаніі па Замошскаму сельсавету да гэтага моманту ніхто нават і не абазваўся. Здаецца, нібы, усё ў парадку, усё дастаткова падрыхтавана, адно толькі чакай вясны, выхадзі на поле ды сей ярыну.

Але ў самай справе зусім інакш: ачыстку насеньня не пачалі, нават такую тэхнічную дробязь ня выканалі як складаньне сьпісаў па забясьпечаньню беднаты насеньнем і г. д.

З пастановай ураду БССР ад 20-га сьнежня 1928 г. аб падняцьці ўраджайнасьці прадстаўнікі сельсавету мала знаёмы, а аб сялянстве і казаць ня прыходзіцца. Нідзе гэтая пастанова не папулярызавана, не растлумачвалася. Адзін толькі селькораўскі гурток у вёсцы Адамаўцы крыху на сваім сходзе нагаварыў аб пастанове ўраду аб падняцьці ўраджайнасьці. Вось уся праца.

Сьпіць усе. Сьпіць сельсавет, сьпіць аграном і разам з імі сьпіць зернаачысьцяльная машына пад павесьцю ў селяніна на хутары Багудзенькі.

Гледзячы на ўсё гэта, хочацца сказаць: таварышы, ці не пара прачнуцца і павесьці агітацыю за ачыстку насеньня, за шматпольле, за калектывізацыю; ці не пара папулярызаваць сярод сялянства зьбіраньне попелу, пастанову аб падняцьці ўраджайнасьці і г. д.

Праежджы.

Хібы ў падрыхтоўцы да сяўбы.

Пры ўсім нашым вопыце правядзеньня падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы мы, аднак, з году ў год робім буйнейшыя памылкі. Наўлічэньне памылак і хібаў мінулых кампаній, адсутнасьць сапраўды „просвещенного" падыходу да працы, прыводзяць да штогадовага паўтарэньня памылак, да такога становішча, калі памылкі робяцца складанаю (і часта вельмі вялікай) часткаю нашае працы. Апраўданьнем звычайна служаць шмат прычын: і масавасьць мерапрыемстваў, і думка, што «той не памыляецца, хто нічога ня робіць», і дабрадушная разважальні накшталт—«як-жа ў вялікай справе без памылак?» Аднак, паўтарэньне адных і тых-жа хібаў і памылак з году ў год кідаецца ў вочы. Яно вымагае ад нас ня толькі напружанай працы, але і ўважлівага вывучэньня вынікаў гэтае працы. Іменна вывучэньне вынікаў неабходна ў правядзеньні масавых мерапрыемстваў, як пасеўная кампанія, дзе канкрэтнае пляваньне кожнай асобнай сялянскай гаспадаркай цяжка і для данага чэрыяду нам не пад сілу, але дзе абавязкова выкананьне пляну ў маштабе ўсёй краіны.

У гэтым артыкуле мы хочам спыніцца на галоўнейшых хібах нашае працы. Штурхачом да гэтага паслужыў артыкул Б. Алычына ў № 61 газэты «Рабочий»,—„Дела и бумажные реки". Вельмі добры артыкул т. Алычына мае ў некаторых мясцох недакладнасьці. Можна было-б гэтым недакладнасьцям не аддаваць увагі, калі-б яны ня былі характэрны для ўсёй нашай працы па падрыхтоўцы да сяўбы. Напіраючы на слабую падрыхтоўку да сяўбы, т. Алычын у пачатку артыкулу піша:

„Праз пяць-шэсьць тыдняў пачынаюцца палявыя работы, а ў нас няма ў дастатковай колькасьці ні пасеўнага матар'ялу, ні мінэральных угнаеньняў".

Да хібаў т. Алычын далей адносіць нашу слабую падрыхтоўку да ваппаваньня глеб і рашуча нападае на тых, хто перашкаджае гэтай справе. Усё гэта правільна, але вывад, які робіцца ў артыкуле ў сувязі з гэтым, зьяўляецца па меншай меры ня сур'ёзным.

„Затое наваліліся мы на торф і попел. У адносіне торфу плян раіць асьцярожнасьць, бо далёка ня вывучана пытаньне аб торфаўгнаеньні. Напрыклад, сфагнумавы торф, як угнаеньне, ня раіцца".

Што азначае «дастатковая колькасьць мінэральных угнаеньняў»? Гэта такая колькасьць, якой у поўнай меры павінна выстарчыць для нашых бедных спажыўнай матэрыяй глеб. Але гэта вялізная колькасьць, для набыцьця якой у нас не хапае сродкаў. Аднак, з году ў год завоз мінэральных угнаеньняў у Беларусь павялічваецца. У параўнаньні з мінулаю вясной мы завозім больш: супэрфасфату—на 1900 тон, калійнай солі—на 877 тон.

Ці дастаткова гэта колькасьць для вырашэньня задач ураджайнасьці, пасхаўленых перад намі? Зразумела, недастаткова. Але-ж выхад трэба знайсьці. Пастаноўка пытаньня — «дайце мінэральных угнаеньняў, тады падвысім ураджайнасьць»—будзе глыбока няправільна. Выхад напрашваецца сам сабой. Скарыстаньне мясцовых рэсурсаў для ўзьняцьця ўраджайнасьці нашых глеб,—вось найбольш правільнае вырашэньне пытаньня на бліжэйшыя гады. Зусім няправільны папрок робіць т. Алычын, калі гаворыць—„затое наваліліся мы на торф і попел". Іменна, «наваліцца» трэба на гэтыя ўгнаеньні, якіх у нас вельмі многа і якія мы, нажаль, мала скарыстоўваем. Асноўная хіба пры правядзеньні вясеньняй сяўбы ў тым, што мы слаба завастрылі пытаньне скарыстаньня мясцовых рэсурсаў для ўзьняцьця ўраджайнасьці. Гэтыя хібы ў апошні час заўважаны, яе пачынаюць выпраўляць.

Многія і не ўяўляюць сабе ўсяго багацьця ўнутраных сродкаў, якія можна скарыстаць для ўзьняцьця ўраджайнасьці.

Кампанія па збору попелу, пачатая сёлета, пры ўсёй неарганізаванасьці гэтай справы, дала некаторыя вынікі.

Да сяўбы мы зможам даць глебе да 300 т. пуд. попелу. Гэта—роўна 60 тыс. пуд. калійнай солі. Завозім-жа мы з-за межаў у сёлетную вясну каля 100 т. пуд. калійнай солі.

Амаль дзьве трэці таго, што ўвозіцца, мы сабралі ў сябе. Зусім лёгка мы можам сабраць 5 мільёнаў пудоў попелу (і ў наступную вясну гэту колькасьць трэба абавязкова сабраць). У пераводзе на калійную соль мы можам мець 1 мільён пудоў угнаеньня, за якое трэба плаціць валюту, калі ўвозіць яго з-за межаў.

Як перавышае гэта завоз калійнай солі з Нямеч. (гэтага году і будучых) і як многа гэта вельмі простае мерапрыемства можа захаваць нам дарагой валюты! Сто тысяч гэктараў можна ўгнаіць сабраным у Беларусі попелам, захаваць сотні тысяч рублёў валюты і практычна вырашыць праблему ўраджайнасьці.

Тое-ж і з торфам. Сяляне далёкай Архангельскай губэрні больш 100 год выкарыстоўваюць торф на ўгнаеньне. Ён настолькі там укараніўся ў сельскую гаспадарку, што для тамашняга сялянства гэта простая і абавязковая работа. У нас торфу больш, чым дастаткова. Аднак, скарыстаньне яго на ўгнаеньне нязначнае. Пры гэтым становішчы, калі гною мала, калі мы можам гноем угнаіць ня больш 40 проц. раллі, а 60 проц. застаюцца бяз гною, праблема скарыстаньня торфу на ўгнаеньне зьяўляецца задачай, патрабуючай тэрміновага вырашэньня. Масавае ўкараненьне торфу, як угнаеньня, у беларускую сялянскую гаспадарку—над гэтым павінен працаваць мясцовы аграном, настаўнік, камсамолец, кожны актыўны селянін. Зьбірае-ж селянін К. Сойткаў, Рагачэўскага раёну, 80 пудоў жыта з дзесяціны пасьля скарыстаньня торфу на ўгнаеньне, а раней зьбіраў толькі 40 пудоў. Селянін П. А. Трапашка, Сьмілавіцкага раёну, дабіўся 139 пудоў жыта з дзесяціны пры дапамозе торфу, а раней зьбіраў толькі 75 пуд. жыта. Такіх сялянскіх гаспадарак у Беларусі добра, калі будзе каля тысячы. А трэба дабіцца, каб усе 800 тысяч сялянскіх гаспадарак скарысталі торф на ўгнаеньне. І пагэтаму на торф таксама трэба «наваліцца», трэба разгарнуць вельмі шырокую прапаганду за скарыстаньне торфу ўсімі сялянамі Беларусі.

Па попеле і торфе мы таму так многа спыніліся, што папроч быў у адносіне гэтых мерапрыемстваў. А колькі іншых мерапрыемстваў, за якія мы яшчэ ня браліся, але за якія павінны ўзяцца і катэгарычна паставіць пытаньне аб самым шырокім скарыстаньні багацьцяў, што валяюцца ў нас пад нагамі і дзякуючы нашай некультурнасьці не скарыстоўваюцца.

Бязумоўна, шкодна сьцьвярджаць, ня ведаючы лічбаў, што ў нас нічога няма да сяўбы. Папершае, мінэральных угнаеньняў мы завозім больш, чымся ў мінулым годзе, а падругое—мы павінны скарыстаць шырока мясцовыя рэсурсы (торф, попел, розныя адкіды).

Услухаю-ж размовы, што ў нас нічога няма, на руку толькі кулацтву, якое рада паагітаваць супроць новых мерапрыемстваў (а ў некаторых мясцох актыўна выступае, каб сарваць зернаачышчэньне і г. д.).

Напрокі ў тым, што мы «наваліліся» на скарыстаньне попелу і торфу, шкодны. Яны паслабляюць энэргію спэцыялістаў, апарату, сялянскіх мас у барацьбе за больш поўнае скарыстаньне таго-ж торфу і попелу. Зьніжаваньне гэтых мерапрыемстваў, паслабляючы энэргію мас, вядзе да пасыўнасьці, да чыста спажывецкіх настрояў. Сутнасьць-жа ўсіх нашых асноўных мерапрыемстваў—гэта ўздым бядняцка-серадняцкіх сялянскіх мас, разьвіцьцё самадзейнасьці, ініцыятывы, без якіх немагчыма рэканструкцыя

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Галоўныя пытаньні VII Усесаюзнага зьезду саюзу працасьветы.

Нядаўна закончыў сваю працу VII Усесаюзны зьезд саюзу працаўнікоў асьветы. Рашэньні яго зьяўляюцца кіраўнічым матар'ялам для ўсіх мясцовых саюзных арганізацый, для кожнага асьветніка паасобку ў іх саюзнай, вытворчай і грамадзкай працы.

Сучасны перыяд сацыялістычнага будаўніцтва, які характарызуецца рэканструкцыяй нашай гаспадаркі, абвастрэньнем клясавай барацьбы ў горадзе і асабліва на вёсцы з прычыны наступу сацыялістычнага сэктару гаспадаркі на капіталістычны, цалкам і поўнасьцю адбіўся на працы зьезду і на яго рашэньнях.

Пераход ад аднаўленьня да рэканструкцыі гаспадаркі, да рэканструкцыі матар'яльнага базісу культасьветнай дзейнасьці ў значнай меры вымяняе працу культасьветных установаў. «Трэці фронт» перастае быць «асобным» фактарам, ён зьяўляецца неразрыўным зьвяном усяго сацыялістычнага перабудоўчага працэсу. Вось чаму зьезд аддаў асаблівую ўвагу пытаньням вытворчага характару, пытаньням падвышэньня якасьці працы культасьветных установаў.

У галіне эканомікі працы зьезд высунуў новыя моманты — гэта ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны сярод працаўнікоў асьветы, паглыбленьне і палепшаньне выхаваўчай працы сярод вучняў, у якой асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на антырэлігійныя і інтэрнацыянальныя моманты, узмацненьне грамадзка-карыснай працы школы сярод акаляючага насельніцтва і барацьбы школы з адноўнымі ўхіламі дробна буржуазнага асяродзьдзя.

Адзінства гаспадарчай дзейнасьці і яе плянаваньне ва ўсім СССР ставіць пытаньне аб уніфікацыі сыстэмы народнай асьветы ўсіх саюзных рэспублік. Зьезд выказаўся за адзіную сыстэму народнай асьветы для ўсяго СССР, захоўваючы толькі некаторыя мясцовыя прыватныя адзнакі ў сыстэме, паколькі такія мясцовыя нацыянальныя асаблівасьці будуць вынуўлены.

У галіне культасьветнай працы зьезд, канстатуючы прагрэсіўнае дробна-буржуазных хістаньняў, хвасьцісцкіх настрояў сярод асобных груп асьветнікаў, прызнаў неабходным сканцэнтраваць максымум увагі на падняцьці палітычнага і культурнага ўзроўню асьветнікаў, на падняцьці іх грамадзкай актыўнасьці і па растлумачэньні задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Жорсткая барацьба з праявамі дробна-буржуазнай ідэалёгіі ў галіне культурнай дзейнасьці, правядзеньне і ажыцьцяўленьне вытрыманай клясава-пралетарскай лініі ва ўсёй працы саюзных органаў і паасобных асьветнікаў—вось галоўнейшыя задачы, прызнаныя зьездам у яго рашэньнях па культпрацы.

Зьезд асабліва падкрэсьліў неабходнасьць больш шырокага і глыбокага разгортваньня крытыкі і самакрытыкі ў саюзе, як найлепшага мэтаду арганізацыі масавай самадзейнасьці і падвышэньня вытворчай і грамадзкай актыўнасьці асьветнікаў. Крытыка і самакрытыка павінна выявіць недахопы, памылкі, бюракратызм, разгільдзяйства ў працы і дапамагчы выявіць гэтыя хваробныя зьявішчы. Зьезд выказаўся за рашучую барацьбу са ўсякімі зьявішчамі, якія перашкаджаюць разгортваньню крытыкі і самакрытыкі, адкуль і ад кага-б яны ні паходзілі.

Зьезд канстатаваў, што, не гледзячы на значнае палепшаньне матар'яльнага становішча асьветнікаў, усё-ж узровень заработнай платы яшчэ нізкі. Зьезд прызнаў неабходным дабівацца, каб тэмп росту заработнай платы на працягу бліжэйшага пяцігодзьдзя быў забясьпечан для асьветнікаў больш хуткі, чымся для іншых груп працоўных, якія ўжо дасягнулі ў заробку да даваеннага ўзроўню.

Разам з гэтым зьезд прызнаў, што пры росьце заробку неабходна імкнуцца да ўстанаўленьня правільных суадносін, якія павінны адбіць ступень кваліфікацыі, цяжкасьць працы і значэньне даванга тыпу ўстаноў для забясьпечаньня патрэбаў важнейшых галін народнай гаспадаркі.

Зьезд па прапанове беларускай і украінскай делегацый вынес пратэст супроць палітыкі польскага фашысцкага ўраду, накіраванай на фізычнае і маральнае ўдушэньне працоўных мас Заходняй Беларусі і Украіны.

Яз. Мацюкевіч.

Стаячае бялота трэба ўскалыхнуць.

Капацкевіцкая сямігодка (на Мазыршчыне) існуе ўжо 10 год, але пралетарская рэвалюцыя мала закранула яе. Глыбока засела ў сямігодцы зарна папоўска-буржуазнага настаўніцтва, якое выхоўвае вучняў у сваім духу. З 12 настаўнікаў сямігодкі мы маем трох з папоўскай сям'і, з якіх адзін быў у старыя часы намецнікам пракурора. Адзін з іх—сын былога буйнога капіталіста, адна—былая абшарніца, рэшта—блізкія сваякі папоў і былых стражнікаў.

Толькі адзін настаўнік-партыец і адзін камсамолец.

У школе панує вялікая нацыянальная розьнь, асабліва востра выяўляецца антысэмітызм і яўрэйскі шавінізм.

Былі выпадкі, калі вучні старэйшых клясаў ужывалі такія выразы: «Ня май жыдоўскай натуры», «Не хачу на жыдоў працаваць», «Адыйдзі, жыд, бо заб'ю».

Пры перавыбарах вучкому беларусы высоўвалі свае кандыдатуры, а яўрэі свае.

У настаўніка Чэрніка Н. Я., сына папа, былога намецніка пракурора, вісяць у куце абразы, вучні-ж заходзяць да яго і бачаць гэта. Геты-ж Чэрнік апавядаў вучн[illegible] што калі намёрла яго жонка, і ён [illegible]ставіў букет кветак перад багародзіцай, дык яна адчыніла вочкі.

Ідэгул ён чалавек рэлігійны. Настаўніца Самбук Ліда, сястра Чэрніка, дачка папа, у часе каляд рабіла ёлку і езьдзіла ў госьці да бацькі—папа.

Настаўніца Белакеўская на вялікдзень ня пусьціла свайго сына ў школу, які заўляе: «1-е Мая, або Кастрычніцкая рэвалюцыя—ня сьвята, а вялікдзень—вось гэта сьвята».

У часе зімовых вакацый у школе былі наладжаны клюбныя вечары, каб гэтым адцягнуць вучняў ад удзелу ў калядных сьвятах і напойках, настаўнік Ліпскі Я., якому было даручана зрабіць даклад на антырэлігійную тэму, дакладу не зрабіў, бо быў п'яны. Другі-ж настаўнік Чаўнавік Ф. таксама прышоў п'яны. Наогул у часе калядаў настаўнікі Ліпскі Я., Шыпоўскі і Чэрнік у прыватніка Кветнага Мордуха-Ёселя, прадстаўніка рэлігійнага культу, ладзілі п'янку два разы. Вучні, разумеецца, таксама не адставалі ад настаўніцтва—хадзілі са зьвяздой, ладзілі рэлігійныя вечары і г. д.

У школе ёсьць любімчыкі з мяшчанскага асяродзьдзя. Калі ў вучаніцы Мухаеўскай М. запыталіся—„чаму табе настаўнік Ліпскі заўсёды добрыя атметкі ставіць», дык яна адказала—«бо я з Ліпскім не адну шклянку гарбаты выпіла». Яны якраз сваякі.

Калі ў сямігодцы ставілася карціна „Акцябр», дык п'яны настаўнік Ліпскі Я., які даваў да яе тлумачэньні, ужываў такія словы, як «таварыш Карнілаў», «таварыш Керанскі». Абураныя вучні напраўлялі настаўніка.

У школе ёсьць харавы гурток, кіраўніком якога зьяўляецца настаўнік Чэрнік. Ён набраў у гурток асоб, пазбаўленых права голасу, служыцеляў рэлігійнага культу і асоб, якія сьпяваюць у царкоўным хоры. На гэтым-жа гуртку ў часе сьпеваў бываюць п'янкі і гульня ў карты.

Калі вучні заходзілі ў настаўніцкую і прасілі настаўнікаў уступіць у грамадзкія арганізацыі, або зьбіралі ахвяраваньні ў карысьць лодзінскіх рабочых, дык большасьць настаўнікаў адказвалі на гэта гіранічным сьмехам. Аб гэтых зьявішчах ведаюць райённыя і акруговыя органы.

У 1927 годзе РВК пастанавіў перакінуць некаторых настаўнікаў у іншыя школы, але АкрАНА пакінула іх на месцах. Цікава—чаму гэта?

Вучні, асабліва камсамольцы, не маглі больш цярпець гэтага безладзьдзя, і па справаздачы вучкому быў складзен наказ, у якім была зьвернута вялікая ўвага на зьнішчэньне ўсіх хваранітых зьявішчаў у школе. Гэты наказ быў прынят вучнямі аднагалосна. Як гром ашаламаціла гэта рэзалюцыя нашых настаўнікаў, не спадабалася ім, што вучні мяшаюцца ў школьныя справы. Чэрнік сабраў харавы гурток і кажа:

— Дзеткі, на нас ганебьне, памятайце, трымайцеся цесна, няхай гэта будзе паміж нас...

Увечары таго-ж дню павінна была быць рэпэтыцыя па падрыхтоўцы спэктаклю для дапрызыўнікаў. Паслалі па Чэрніка камсамольца-батрака. Той па сваёй прастаце і кажа Чэрніку:

— Вас звалі на рэпэтыцыю.

А той яму ў адказ:

— Як гэта звалі? Хто мае права мяне зваць? Ніхто ня мае права мяне зваць—прасіць, прасіць толькі мяне могуць.

У часе-ж рэпэтыцыі Чэрнік са сваімі падзьвіжнікамі зьбіраўся групкамі і па адрасу камсамольцаў круціў фігі, прыгаварваючы: «вось ім, вось ім, і крычаў: я ім пакажу, сукіны сыны». Выбягаў са сваёй кампаніяй у калідор і адтуль чуцен быў моцны рогат і лаянка. Па адрасу камсамольцаў цэлы вечар складалі розныя анэкдоты.

Праспала і наша камісія па абкладаньню платай за навучаньне. Ёсьць факты, калі на вучняў-беднякоў накладалі плату, а на заможнікаў не накладалі. На адну вучаніцу-бяднячку налажылі плату, якая ня мае ніякіх сродкаў і змушана цяпер хадзіць па людзях язычыць дзяцей і мыць бялізну, зарабляючы такім чынам сабе на кавалак хлеба і плаціць за навучаньне.

Не пералічыць усіх ганебных фактаў з жыцьця Капацкевіцкай сямігодкі. У такіх умовах сямігодка далей існаваць ня можа.

Дзярнач.

Юныя каапэратары.

(В. Баршчоўка, Гом. акругі і райёну).

Два гады таму назад у нашай школе адчыніўся свой каапэратыў. Дзеці ўнесьлі па 10 кап., некаторы ўклад зрабіла настаўніцтва, і праца распачалася. Кіраваньне, рэвізыямісію і прадаўца вызначылі самі вучні. Тольні спачатку дзеля нагляду быў прымацован да каапэратыву адзін з настаўнікаў, а зараз дзеці працуюць зусім самастойна.

Апрача ведаў і звычак яніх дае праца ў каапэрацыйнай галіне, школьны каапэратыў вызваліў вучняў ад неабходнасьці стаяць у чарзе ў мясцовым спажывецкім т-ве.

НА ЗДЫМКУ—праверка наяўнасьці тавараў перад 1 сакавіка.

МІКОЛА АЛЬБІЦКІ.

ДАПАМОГА ВУЧНЯМ-БЕДНЯКАМ.

Прапанова, якая заслуговае ўвагі.

У гэтым годзе школы атрымалі сродкі на набыцьцё вопраткі ды абутку для бяднейшых вучняў. Наша школа, напрыклад (Галавінецкая, Гомельскага р.), атрымала 110 руб., за якія праз каапэрацыю набыта матар'ялу на 9 пальцішак і 10 пар ботаў. Дагэтуль боты і пальцішкі зусім цэлыя—берагуць дзеці падарунак савецкай улады.

Разумеецца, на дасягненьнях гэтага году супыніцца нельга. Само жыцьцё падказвае, што ў наступным годзе дапамогу неабходна падвоіць. Апрача таго, нашым выкаўчым органам аб разьмеркаваньні гэтых сродкаў неабходна пакланаціцца раней, каб яны прышлі на месца не пазьней пачатку навучальнага году.

На мой погляд, тую вопратку і абутак, якімі дзеці карыстаюцца ў бягучым навучальным годзе, трэба па тэрмін да пачатку навучальнага году затрымаць у школе, каб яна ўлетку дарэмна ня гнілася.

Хоць вопратка і будзе крыху пасвавана, але яе ў наступным навучальным годзе будзе лягчэй падраманта-ваць, чымся набыць новую, і гэта дасьць некаторую эканомію.

Гэта-ж паспрыяе і большаму і хутчэйшаму прыходу ў школу бяднейшых вучняў, бо тыя, што здадуць вопратку, будуць сьпяшацца, каб атрымаць яе зноў, а навічкі будуць мець большую надзею на дапамогу і ахвотней пойдуць у школу.

Д. Кнышаў.

Патрэбна пэдалёга-пэдагагічная канфэрэнцыя.

Пры БДУ на працягу апошніх год на некаторых дысцыплінах сярэдняй школы былі праведзены канфэрэнцыі настаўніцтва. Ня гледзячы на навуковы зьмест дакладаў, на значную цяжкасьць успрыймання чытанага матар'ялу для нашага масавага настаўніка,—нельга сказаць, што бескарысна быў згублен час. Шмат новага, прасоўваючага думку наперад, як па мэтодыках асобных прадметаў, так і ў напрамку падвышэньня кваліфікацыі было набыта ўдзельнікамі канфэрэнцый з розных далёкіх куткоў Беларусі. Навейшая пэдагагічна-мэтадычная літаратура, сучасны стан навукі па тых ці іншых праблемах школьнага жыцьця, пэўная навукова-матэрыялістычная ўстаноўка па цэламу шэрагу пытаньняў, каштоўная зарадка на далейшую працу энэргіяй і ведамі па шляху пабудовы і замацаваньня пралетарскай культуры—вось што далі канфэрэнцыі, арганізаваныя пэдфакам БДУ.

Жывы памен думкамі в навуковымі сілкмі, калектыўнае абгаварэньне і разьвязаньне пытаньняў, вопыт з мейсц—усё гэта багата шырыць кругавід настаўніка, паглыбляе пэдагагічныя веды і сьвядомасьць.

Чутны галасы на старонках „Працаўніка Асьветы", што апошняя фізыка-матэматычная канфэрэнцыя мала дала. Навуковасьць мовы, адцягнуты зьмест дакладаў, наведаньне дакладчыкамі беларускіх мясцовых умоў і праграм НКА—такавы прычыны некаторага нездаволеньня. Няхай нават так. Тады міма волі просіцца пытаньне—чаму масавае настаўніцтва, багатае мясцовым вопытам і практыкай не праламіла тэарэтычныя палажэньні позвы канфэрэнцыі праз прызму мясцовых умоў працы?

Масавы настаўнік аліжэй павінен бачыць недахопы праграм НКА і тых або іншых падручнікаў, бо ён у штодзённым ужытку імі карыстаецца. Нас таўнікі маглі праз справаздачы з мейсц праверыць арганізацыю і мэтады свайго пэдпрацэсу праз тэорыю, праз навуковыя аўтарытэты.

Ня гледзячы на некаторыя недахопы, асьветніцкія масы ўдзячны НКА, Унівэрсытэту і Цэнтральнаму Праўленьню Саюзу Працасьветы за арганізацыю такога характару канфэрэнцый.

Хваляй жыцьця зараз вымагаецца скліканьне пэдалёга-пэдагагічнай канфэрэнцыі. Зусім слушна, што дзеля правільнай арганізацыі выхаваўча-адукацыйнага працэсу пэдагог павінен усебакова ведаць свой аб'ект—дзіця. Правільная арганізацыя выхаваньня і адукацыі маладога пакаленьня прымушае ведаць эканамічныя, сацыяльныя, палітычныя і бытавыя умовы, у якіх знаходзіцца школа і падрасьледны. Агулам кажучы, на чарзе дню—пэдалёгічнае вывучэньне школьніка, бо толькі тады магчыма выхоўваць здаровую моцную зьмену.

Як рацыянальна ў школах I і II канцэнтру паставіць вывучэньне фізычнага разьвіцьця дзяцей, як абсталяваць прасьцейшы і таны пэдалёгічны габінэт (апаратуру яго) для школьнага ўжытку, як павінна праводзіцца з мэтадалёгічнага боку азнаямленьне з быгам і асяродзьдзем дзіцяці, як вымяраць рэакцыі дзіцяці, як праводзіць тэставаньне, мэтодыка - статыстычнай апрацоўкі тэстаў і г. д.—вось цэлая серыя пытаньняў, якія пасьпелі, а вопыту і практыкі ў настаўнікаў тут мала.

Складаньне біо-сацыяльнага профіля дзіцяці, пэдалёгічнага фармуляра, дасьледаньне агульнай і спэцыяльнай адаптацыі дзіцяці, разумовай здольнасьці яго—актуальныя пытаньні сучаснай пэдалёгіі і пэдагогікі. Пара нашым школам ужываць ужо сыстэму тэставаньня вучняў, сыстэму складаньня „псыхалёгічнага профіля".

Пытаньні, як набудаваць добрую лекцыю, як падыходзіць да непадатлівых у сэнсе выхаваньня дзяцей, нарэшце, як разьвязаць шэраг «хворых пытаньняў» пэдагагічнай практыкі—вельмі хвалююць масавага настаўніка. Пэдалёгія і рэфлексалёгія дапамагаюць настаўніку навукова падыйсьці да спосабаў набудаваньня лекцыі, паказваюць шлях на выбару мэтадаў працы.

Пэдагог можа, пры ўменьні, выпрацоўваць новыя карысныя ўнёўныя рэфлекты, утвараць пэўныя рэакцыі ў працэсе свайго пэдагагічнага ўзьдзейнічаньня. Патрэбны веды, а іх можа даць толькі навуковая інстытуцыя, як наш Пэдфак БДУ, псыхатэхнічная лябараторыя пры Інстытуце Аховы Працы. На пэдалёга-пэдагагічнай канфэрэнцыі ва ўсю шырыню павінны быць пастаўлены вышэй памянёныя пытаньні. На канфэрэнцыю неабходна адвесьці 4—5 дзён.

Позва яе—пытаньні экспэрымэнтальнай пэдагогікі, рэфлексалёгіі і пэдалёгіі, практычнае азнаямленьне з інструмэнтарыем і мэтодыкай пэдалёгічнага дасьледваньня дзяцей школьнага ўзросту—арганізацыя школ, складаньне выт-ворчых плянаў, пытаньні дысцыпліны і ўнутранага парадку, плянаваньне і ўлік працы наводзе комплексу. Сучасная пэдалёгія ўжо вышла з рамак акадэмічнасьці і вузасьці, пасьпеў час падвядзеньня пэдалёгічнага грунту, навуковага базісу і ў звычайнай школе пад усе пытаньні школьнай працы. Адсюль вынікае задача—разумна і своечасова выкарыстаць шуканьні настаўніцтва ў гэтым напрамку. Канфэрэнцыя па сваім значэньні павінна разгарнуцца ў першы пэдалёга-пэдагагічны зьезд на Беларусі.

НКА, выпушчаючы ў гэтым годзе інструкцыю дашкольных тэстаў пад рэдагаваньнем Зьмітрака Сьцапуры, відаць, цьвёрда становіцца на пэдалёгічныя рэйкі працы, таму трэба думаць што ён адгукнецца на склік канфэрэнцыі.

М. Цэхановіч.

Ворша.

ДАПАМАГЛІ 59 ВУЧНЯМ-БЕДНЯКАМ.

Цімкавіцкая беларуская сямігодка (Менская акр.) налічвае 457 вучняў. У сямігодцы шмат навучэнцаў як месцачковай, так і вясковай беднаты. Дзеля дапамогі бяднейшым вучням была складзена камісія, якая зьвярнулася да насельніцтва мястэчка і розных арганізацый і ўстаноў за дапамогай. Месцачковы савет актыўна дапамагаў працы камісіі.

Усяго было сабрана 733 руб. 31 кап., з якіх: 125 руб. даў РВК (5 стыпэндый), 150 р. выдзеліла спажывецкая каапэрацыя, 50 руб. сельска-гаспадарчае т-ва, 75 руб. гарбарнае т-ва, 15 руб. банк самаатчын. кредыту, паўзьмежны атрад ДПК даў 20 пар абутку, калі 200 руб. было сабрана па падпісных лістох сярод насельніцтва, і РВК дадаткова выдаў 10 пар ботаў для дзяцей беднаты—вучняў I канцэнтру.

З сабраных грошай 100 рублёў было выдзелена для аказаньня дапамогі бяднейшым вучням яўрэйскай чатырохгодкі, а рэшта выдаткавана на дапамогу бяднейшым вучням бел. сямігодкі.

Атрымала дапамогу 59 чалавек, самыя бяднейшыя атрымалі і абутак і вопратку.

М. Лазюк.

ІНСПЭКТАР ГУЛЯЕ У АДЦЯЖКУ.

У Чэрнаўскай школе (Чэрвенскі р., Менск. акр.) вучняў беднаты, якой неабходна дапамога, 14 чалавек, 9 з іх падлягаюць абавязковаму навучаньню. Дзеля дапамогі ім РВК адпусьціў 10 р., Руднянскі камітэт узаемадапамогі—5 руб., Верхменскае спаж. т-ва —3 руб. 48 к. і сабрана па падпісным лісьце 3 руб. 8 к.

За гэтыя сродкі пашыта 4 сьвіткі, купшена на 2 руб. сшыткаў і выпісана на 2 руб. 10 к. дзіцячай літаратуры.

Школьная рада пастанавіла 24-XII 28 г. вылучыць на дапамогу беднаце 20 руб. са зродкаў ад школьнага зям. вучастку.

Але сродкі ад зям. вучастку (65 р.) знаходзяцца ў інспэктара нарасьветы, і камісія да гэтага часу грошы яшчэ не атрымала. То інспэктара дома няма, то чэкаў няма.

Вясковы.

ДОБРЫ ПРЫКЛАД.

Шмат вучняў-беднякоў у Крайскай школе (Плешчавіцкі р. Мен. акр.). Каб дапамагчы ім вучыцца, пагранічныя вайскоўцы наладзілі дабраахвочы збор як вопраткі, так і прадуктаў. Некаторыя давалі нават хромавыя чаравікі, галёшы, фуфайкі і іншыя рэчы.

В. Т-іч.

Наша перапіска.

М. Сураўну. Бабруйск. На ваш ліст ад 2 лютага г. г. Бабруйскае акр. адз. працасьветы прыслала тлумачэньне, у якім даводзіць беспадстаўнасьць вашых дакладу.

Я Ненік. Легойск. Па пытаньню аб перасьлядзе на працу ў Сібір зьвярнецеся ў Наркамасьветы РСФСР.

М. Шумейну. Круглянскі райён, Аршанскай акр. Доніс «Зьдзеі над настаўніцай Горбік» пераслалі ў Круглянскі райвыканком асьветнікаў дзеля накіраваньня ў суд да справы наст. Горбік.

Вясковаму Чарнава. Аб паводзінах вучня Дзергача паведаміце загадчыку школы. Друкаваць ня будзем.

А. Чырвонаму. Полацак. Доніс «Хто ён такі» пераслалі ў Наркамасьветы.

М. Е. А. А. Гарадок. Доніс „Вось дык па пралетарску" друкаваць ня будзем. Пастанову акр. суду па справе наст. Хлабдзевіч можаце абскардзіць у вышэйшыя судовыя арганы.

Ліквідатару В. К. Гомельшчына. На ваш запытаньне ЦК саюзу нарасьветы паведамляе, што «стаўку ў 45 руб. у месяц павінен атрымліваць той настаўнік, які штодня будзе працаваць на ліквідацыі ці ў школе малапісьменных 1 ня мае другой працы».

Быкоўскаму. Арш. акр. На ваш доніс «Духоўная настаўніца» Круглянскі райвыканком асьветнікаў паведамляе, што настаўніца Горбік з 27 студзеня з працы зьнята, і справа аб ёй хутка будзе разьбіраца ў судзе.

ПРАЗ СЯМ'Ю—У ШЫРОКІЯ ГРАМАДЗКІЯ ГУШЧЫ.

Уся выхаваўча-навучальная сыстэма нашай школы грунтуецца на вывучэньні працоўнай чыннасьці людзей, прыроды і грамады. Працоўная чыннасьць людзей—цэнтральны стрыжань, наўкол якога яднаецца ўсё іншае. Прырода вывучаецца з пункту гледжаньня яе значэньня ў жыцьці чалавека і ўсёй працоўнай чыннасьці, з таго-ж пункту гледжаньня вывучаецца і грамада.

Дзеля выкананьня свайго выхаваўча-навучальнага пляну школа павінна як найцясьней зьвязацца з акаляючым жыцьцём, каб чэрпаць з яго жывы матар'ял для сваёй працы, а таксама каб магчыма было перакінуць новыя пэдагагічныя ідэі ў грамаду. У зьвязку з гэтым ад школы патрабуецца шырокае разгортваньне грамадзкай працы і найцясьнейшая сувязь з жыхарствам.

У вёсцы школа зьяўляецца асяродкам культурнага жыцьця, там школа тысячамі ніцяў зьвязана з акаляючым жыхарствам, яго культурай і гаспадаркай. Гарадзкая школа ў гэтых адносінах знаходзіцца ў горшых варунках, асабліва калі яна ня зьвязана з вытворчасьцю. Таму многія гарадзкія школы ня маюць базы і для шырокай грамадзкай працы.

Як для вясковай школы, так і для гарадзкой першачарговае значэньне ў справе сувязі яе з акаляючым жыцьцём мае сям'я вучня, з якой школа і павінна разгарнуць плянавую працу. Але ня кожная школа поўнасьцю карыстае гэту галіну па-за школьнай працы, магчыма таму, што ня зусім стала прадумала вапрамак і формы гэтай працы і ня ўмее зьвязаць яе з праграмнай працай кожнай групы.

Лягчэй за ўсё пачынаць працу з сям'ёй з першых моментаў паступленьня дзяцей у школу. Калі ў першы год наладжана шчыльная сувязь з сям'ёй, дык гэта сувязь ня спыніцца і на ўвесь час наведваньня дзіцяці ў школу.

Іскодны момант гэтай сувязі—здароўе дзіцяці, яго рэжым, адносіны да школы і да бацькоў.

Адначасова з навучальнай працай, якая закранае ўсе бакі жыцьця дзяцей, у малодшых групах школа арганізуе самадзейнасьць дзяцей, накіраваную ў першыя часы галоўным чынам на саміх сябе, на сваё хатняе жыцьцё: палепшаньне гігіенічных умоў, асабовая гігіена, арганізацыя гульні, працы. Спачатку дзіцянё вылуляе сваю самадзейнасьць у сваёй сям'і. Але для сямі-васьмігадовага дзіцяці гэта ўжо шырокая самадзейнасьць, калі яно дапагаецца дома, каб яму далі магчымасьць належна мыцца, мяняць бялізну, чысьціць зубы, аднаму спаць, наладзіць свой куток.

Адначасна з гэтым у клясе ствараецца арганізацыя, якая сочыць за чыстатой дзяцей, за тым, як яны харчуюцца. Гэта арганізацыя абмяркоўвае пытаньне ўплыву на сваіх таварышоў і на іхныя сем'і. Тут такім чынам мы ўжо будзем мець калектыўную чынасьць, але ўсё ў тым-жа мірунку асобавай гігіены дзяцей.

Наступны крок да пашырэньня самадзейнасьці дзяцей гэта—арганізацыя бацькоўскіх сходаў, каб дабіцца з боку бацькоў падтрыманьня ў дзіцячых пачынаньнях. Тут дзеці самі пачнуць узьнімаць перад настаўнікам гэта пытаньне, пачнуць скардзіцца, што бацькі не даюць ім ажыцьцяўляць вынайдзеныя мерапрыёмствы, напр., чысьціць зубы, асобна спаць, адчыняць фіртку і г. д. Разам з гэтым дзеці будуць прасіць настаўніка пагаварыць з бацькамі. Самі-ж дзеці з ахвотай прымуць удзел усім калектывам у арганізацыі бацькоўскіх сходаў. Бацькоўскія сходы становяцца ня толькі справай настаўнікаў, але і вучняў.

Праца з бацькамі—вельмі важная, цікавая і карысная галіна грамадзкай працы школы з першай да апошняй клясы. Самыя ўдалыя сходы тыя, на якіх выступаюць з дакладамі і дэманстрацыяй сваёй працы самі дзеці. Ім заўсёды ўдаецца заваяваць спачуваньне бацькоў і дабіцца практычных вынікаў. Так удаецца наладзіць гігіену дзяцей, змагацца супроць благіх адносінаў да дзяцей, супроць пэдагагічных уплываў на дзяцей дома і г.д. Праз такія сходы школа можа таксама рабіць уплыў на арганізацыю працы дзяцей, растлумачыць бацькам неабходнасьць працоўнага выхаваньня, якога, нажаль, зараз ня мае большасьць гарадзкіх дзяцей і г. д.

Дзеля большага посьпеху бацькоўскіх сходаў варта ладзіць на іх выступленьні дзяцей і ня толькі з расказамі аб сваёй працы, але і з дэклямацыяй, сьпевамі, рытмічнымі рухамі і інш.

Вялікую ролю адыгрываюць школьныя выстаўкі, ня толькі гадавыя, але і трымэстравыя і нават тэматычныя, калі яны добра наладжаны, вылуляюць зьмест і мэтад працы і калі тлумачэньні да іх даюць самі дзеці. Звычайна бацькі вельмі пацяшаюцца дасягненьнямі сваіх дзяцей, а галоўнае —на выстаўцы ім становіцца зразумелай праца школы.

Ня меншае значэньне маюць сьвяты, арганізаваныя ў школе з удзелам бацькоў.

На рэвалюцыйных сьвятах бацькі знаёмяцца з настаноўкай у школе палітычнага выхаваньня, бачаць дасягненьні ў галіне мастацкага выхаваньня, у галіне фізычнай культуры.

Такая праца школы зьвязана з пэдагагічнай прапагандай і прыцягненьнем бацькоў да ўдзелу ў навучальна-выхаваўчай справе.

Бацькі надта цікавяцца посьпехамі сваіх дзяцей, а школа зацікаўлена ў тым, каб бацькі разумелі яе працу і дапамагалі ей. Таму трэба, каб ва ўсіх групах нэрэгулярна ладзіліся на бацькоўскіх сходах даклады вучняў аб працы і каб на ўсе выступленьні і сьвяты прынгваліся бацькі. Таксама трэба дабіцца, каб бацькі рабілі агляды школьных выставак. Гэта дапамо[illegible]ўтэй зьнішчыць некаторае неадаволеньне сярод жыхарства новай школай, яе пачынаньнямі, якое яшчэ мае месца ў некаторай частцы жыхарства.

Бацькі ня толькі будуць разумець новую школу, яе мэты і каляіны, але будуць і дапамагаць ёй у працы.

З цягам часу трэба бацькоў усё больш і больш цягнуць у працу школы.

Як вядома, першыя групы працуюць над пытаньнямі быту. Тут, разумеецца, нельга абыйсьці маленькіх дзяцей у сям'і, якія яшчэ ня ходзяць у школу.

Школа павінна імкнуцца захапіць гэтых дашкольнікаў у поле сваёй увагі. Трэба навучыць дзяцей-вучняў абыходзіцца з малышамі, прывіваць ім гігіенічныя навычкі, расказываць ім, налявать, вучыць гульням, адным словам—перадаваць ім тое, што вучні самі набываюць у школе, выбіраючы тое, што надыходзе для малышоў-дашкольнікаў.

Але гэтым нельга абмежавацца—трэба гэтых дашкольнікаў прыцягнуць да школы, паступова прывучыць іх да школы. Дзеля гэтага вельмі карысна ладзіць для іх спэцыяльныя раніпшікі з самай просьценькай, зразумелай і цікавай праграмай. Можна, скажам, інсцэніраваць якую-небудзь просьценькую прыродазнаўчую казку, падрыхтаваць належныя сьпевы, гульні і г. д. Разумеецца, гэта яшчэ больш прывяжа да школы і бацькоў.

Дзеці старэйшых груп могуць весьці асьветную працу з дарослымі членамі сям'і: праз наведамленьне навуковых ведаў, набытых у школе, кіраўніцтва чытаньнем, распаўсюджаньне кніг, правядзеньне супольных экскурсій, разумеецца, прапрацаваных раней у школе. Школа можа і павінна весьці працу з бацькамі ня толькі дзеля прыцягненьня іх да школы і дзеля пэдагагічнай прапаганды—яна можа даць бацькам і веды. Напрыклад, чацьвертая група можа ладзіць даклады аб прыродзе, ладзіць гутаркі аб беспадстаўнасьці розных забабонаў і г. д.

Апрача дакладаў і гутарак, школы павінны пакланаціцца аб пастаноўцы спэктакляў, літаратурных вечароў, аб наладжаньні выставак на паасобныя тэмы праграмы, на рэвалюцыйныя тэмы, па пытаньнях гігіены і г. д. Кожнае выступленьне павінны ладзіць тыя групы, якія працуюць над гэтай тэмай. Для іх такія выступленьні будуць адначасна і грамадзкай працай і падагуленьнем сваёй навучальнай працы.

Усе апісаныя формы сувязі з бацькамі праводзяцца праз дзяцей, зьвязаны з іхнімі вучэбнымі заняткамі і зьяўляюцца адбіткам іхняй грамадзкай працы.

Дзіцячую працу, разумеецца, павінен арганізаваць і накіроўваць настаўнік. Апрача гэтага, ня ўсё могуць і зрабіць дзеці. Частка працы кладзецца выключна на настаўнікаў, ня кажучы ўжо аб тым, што дзецям патрэбна падтрыманьне пэдагогаў. Выступленьні дзяцей настаўнік павінен папоўніць; настаўнік павінен адказаць на тыя запытаньні, на якія дзеці ня могуць адказаць самі.

З сыстэматычнай працы з бацькамі разьвіваецца пэдагагічная кансультацыя. Наведваньне настаўнікам сям'і вучня таксама спрыяе разьвіцьцю кансультацыі. Надта карысна было-б, каб пры школах былі папулярныя бібліятэчкі па пэдагагічных пытаньнях, тады магчыма было-б час ад часу выдаваць з гэтай бібліятэчкі кніжкі бацькам.

На дапамогу сваёй школьнай і пазашкольнай працы настаўнік можа прыцягнуць групу бацькоў-актывістаў, асабліва прымацаваных да школы дзяжгатаў. Такія групы бацькоў надта карысны, напрыклад, у справе абсьледваньня быту дзяцей дома.

Так паступова разьвіваецца праца з бацькамі на глебе прыцягненьня іх да ўдзелу ў жыцьці школы і спосабам пэдагагічнай прапаганды.

Далейшы этап—перанясеньне працы школы за сьцены школы, на прадпрыёмства, у сельсавет, у шырокія грамадзкія колы. З імі школу зьвяжуць зноў такі бацькі, уцягнутыя ў працу школы, зацікаўленыя ёю і зразумеўшыя яе. Найбольш хвалюючыя бацькоў пытаньні і асабліва зацікавіўшыя іх трэба вынесьці на абгаварэньне самай шырокай грамадзкасьці. Гэта дасьць магчымасьць зьнішчыць шмат хваравітых зьявішчаў у нашай школе, якія яшчэ ў значнай меры паралізуюць яе працу.

Пасьпяховае разьвіцьцё апісанай намі працы магчыма толькі пры тых умовах, калі пэдагагічная праца самой школы на належнай вышыні.

Само сабой зразумела, што праца разьвіваецца паступова і не адразу набывае поўны размах. Трэба заваяваць давер'е бацькоў, зацікавіць іх працай школы і як мага бліжэй прыцягнуць іх да ўдзелу ў гэтай працы—тады яна дасьць багатыя вынікі.

Бяз шчыльнай сувязі з бацькамі, а праз іх і з самымі шырокімі коламі нашай грамадзкасьці—школа ня можа справіцца са сваімі навучальна-выхаваўчымі задачамі і ня зможа належным чынам разгарнуць грамадзкую чыннасьць.

Я. П.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зацьверджаньне палажэньня аб Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

I. Зацьверджаць Палажэньне аб Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

II. Скасаваць: 1) палажэньне аб Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі за 3 лістапада 1924 г. (З. З. БССР 1924 г., № 25—26, арт. 225); 2) пастанову ЦВК і СНК «Аб пашырэньні праў Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі» за 14 ліпеня 1927 году (З. З. БССР 1927 г., № 32, арт. 161) і 3) пастанову СНК за 6 красавіка 1923 г. «Аб наданьні Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі права бясплатна атрымоўваць афіцыйныя выданьні" (З. З. БССР за 1923 году, № 7, арт. 59).

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2 сакавіка 1929 г., г Менск.

ПАЛАЖЭНЬНЕ

ПРА НАРОДНЫ КАМІСАРЫЯТ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЕ ІНСПЭКЦЫІ БССР.

1. Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР праводзіць у жыцьцё мерапрыёмствы па ўдасканаленьні дзяржаўнага апарату, па поўным аўладаньні ім і прыстасаваньні яго да задач сацыялістычнага будаўніцтва.

2. Па лініі рацыяналізацыі дзяржаўнага адміністрацыйнага і гаспадарчага апарату, вытворчых працэсаў і тэхнікі кіраўніцтва да кампетэнцыі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР належыць:

а) практычнае і тэарэтычнае вывучэньне справы кіраўніцтва, выяўленьне недахопаў і дасягненьняў органаў кіраўніцтва, зьнішчэньне недахопаў і замацаваньне дасягненьняў;

б) распрацоўка і зьмена структуры дзяржаўных органаў, устанаўленьне рацыянальных мэтадаў адміністраваньня і ўзаемадносін паміж работнікамі дзяржаўнага апарату з мэтаю палепшыць, спросьціць работу і забясьпечыць кантроль і нагляд з боку дзяржавы за яго дзейнасьцю;

в) вывучэньне і распрацоўка пытаньняў удасканаленьня ўзаемаадносін паміж пасобнымі органамі дзяржаўнага апарату з мэтай дацэнтралізацыі апэрацыйнай работы і набліжэньня апарату да насельніцтва;

г) вывучэньне і распрацоўка пытаньняў тэхнікі кіраўніцтва, устанаўленьне найбольш рацыянальных форм абслугоўваньня насельніцтва;

д) правядзеньне досьледаў і ажыцьцяўленьне практычных мерапрыёмстваў па рацыяналізацыі адміністрацыйнае тэхнікі, справаводзтва і справаздачнасьці;

е) вывучэньне пастановаў рахункаводства і справаздачнасьці ў дзяржаўных і грамадзкіх установах і арганізацыях БССР; устанаўленьне мэтадаў падліку, справаздачнасьці, калькуляцыі і складаньня балянсу;

ж) устанаўленьне для дзяржаўных і грамадзкіх установ і прадпрыёмстваў нармальных штатаў, распрацоўка тыповай номенклятуры штатных пасад і характарыстыка іх;

з) агульнае кіраваньне і ўзгадненьне дзейнасьці ўсіх установ, якія заняты вывучэньнем пытаньняў навуковай арганізацыі працы, вытворчасьці і кіраўніцтва; агульны нагляд за дзейнасьцю ведамсьцьвенных органаў рацыяналізацыі;

і) плянаваньне, рэгуляваньне і ўзгадненьне кантрольнае і рэвізійнае працы пасобных органаў;

к) вывучэньне і распрацоўка пытаньняў рацыяналізацыі асноўных вытворчых і апэрацыйных працэсаў работы ў галіне прамысловасьці, гандлю, сельскай і лясной гаспадаркі, крэдыту, а таксама адміністрацыйнай і сацыяльна-культурнай працы дзяржаўных і грамадзкіх органаў

л) усямернае пабуджэньне дзяржаўных, адміністрацыйных, гаспадарчых, а таксама і грамадзкіх органаў да палепшаньня іх апарату, аказаньне ім дапамогі ў гэтых адносінах, падбіў іх практыкі, узгадненьне і аб'яднаньне прыймаемых імі захадаў.

3. На лініі вывучэньня і распрацоўкі гаспадарчых і сацыяльна-культурных праблем да кампетэнцыі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР належыць:

а) праверка выкананьня дзяржаўнымі і грамадзкімі арганізацыямі дырэктыў органаў савецкай улады;

б) кантроль за правільнасьцю работы дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый, змаганьне з бюракратызмам, цяганінаю, прагвакцыянізмам, безгаспадарнасьцю, злоўжываньнямі і д. т. п. у дзяржаўным і грамадзкім апараце;

в) праверка і ацэнка па сутнасьці работы кіраўнікоў і супрацоўнікаў адміністрацыйных і гаспадарчых органаў БССР, садзейнічаньне ім у падборы работнікаў; прыняцьце належных захадаў да практычнай падрыхтоўкі і вылучэньня рабочых і сялян на кіруючыя пасады;

г) асабліва дакладная праверка дзяржаўнага адміністрацыйнага і гаспадарчага апарату ў частны жывое сувязі яго з насельніцтвам, сыстэматычнае выкарыстоўваньне савецкага, партыйнага і прафэсыянальнага друку для бязьлітаснай барацьбы з усімі супрацоўнікамі дзяржаўных органаў, якія выяўляюць нядбайныя адносіны да патрэб і запытаньняў рабочых і сялян, асабліва напісьменных і малапісьменных;

д) абсьледаваньне і вывучэньне прычын злоўжываньняў і безгаспадарнасьці кіраўнікоў і іншых працаўнікоў дзяржаўных органаў, і змаганьне в сыстэмаю подкупаў, кабарніцтвам праз устанаўленьне сумесных з адпаведнымі судовымі і адміністрацыйнымі органамі дырэктыў.

5. Па лініі дапамогі працоўным у ажыцьцяўленьні іх праў да кампетэнцыі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР належыць:

а) прыём ад працоўных заяў і скаргаў на недахопы апарату, на ігнараваньне патрэб працоўных, на цяганіну і г. д.;

б) правядзеньне расьсьледаваньняў па прынятых заявах і скаргах і прыняцьце належных мерапрыёмстваў для абароны праў працоўных і вынічэньня цяганіны.

6. Рабоча-Сялянская Інспэкцыя працуе ў шчыльнай сувязі з прафэсыянальнымі саюзамі, вытворчымі нарадамі, кантрольнымі камісіямі прадпрыёмстваў, фабрычнымі камітэтамі, мясцкомамі, эканамічнымі камісіямі, сакцыямі саветаў, дэлегацкімі сходамі работніц і сялянак і д. т. п. Рабоча-Сялянская Інспэкцыя прыцягвае рабочых да сваёй працы праз абмеркаваньне на агульных заводзкіх сходах, адчытных сходах ячэек, клюбных сходах і г. ц. — вынікаў абсьледаваньня дзейнасьці ўстаноў, прадпрыёмстваў і арганізацый. Праверку работ пасобных дзяржаўных і грамадзкіх органаў Рабоча-Сялянская Інспэкцыя павінна таксама праводзіць пад кіраўніцтвам работнікаў Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі сіламі рабочых, якія выбіраюцца заводзкімі сходамі.

7. Для ажыцьцяўленьня ўскладзеных на Народны Камісарыят Рабоча Сялянскае Інспэкцыі задач яму даюцца наступныя правы:

а) праводзіць рэвізійна - інспэкцыйныя абсьледаваньні ўсіх цэнтральных і мясцовых дзяржаўных і грамадзкіх устаноў і прадпрыемстваў і іх аб'яднаньняў, у тым ліку і каапэрацыйных органаў БССР, а таксама акцыйных кампаній, мяшаных таварыстваў, канцэсійных прадпрыемстваў і грамадзкіх арганізацый, якія атрымліваюць субсыдыі ад дзяржавы ці апэруюць дзяржаўным капіталам альбо грамадзкімі зборамі і паступленьнямі.

Дзяржаўныя прадпрыемствы, якія арандуюцца прыватнымі асобамі, арганізацыямі альбо прадпрыемствамі ці адданы ў канцэсію, абсьледуюцца Рабоча-Сялянскаю Інспэкцыяю паводле існуючых паміж імі і дзяржавою дагавораў;

б) патрабаваць ад усіх дзяржаўных устаноў і грамадзкіх арганізацый БССР матар'ялы, дакументы, акты, тлумачэньні, справаздачы і іншыя зьвесткі, якія характарызуюць іх становішча і дзейнасьць, а таксама выклікаць кіраўнікоў і працаўнікоў органаў, якія абсьледуюцца, для дачы асабовых тлумачэньняў і для ўдзелу ў нарадах і пасяджэньнях, дзе абмяркоўваюцца пытаньні, узьнікаючыя пры абсьледваньнях;

в) рабіць прапановы ўсім дзяржаўным установам, прадпрыемствам і арганізацыям: 1) аб зьнішчэньні выяўленых недахопаў, 2) аб правядзеньні належных мерапрыемстваў па рацыяналізацыі іх апарату, 3) аб звальненьні службовых асоб за значны недагляд і безгаспадарнасьць, 4) аб налажэньні дысцыплінарных пакараньняў у парадку і ў межах, паказаных у законе;

г) падаваць на разгляд цэнтральных і мясцовых органаў БССР і Народнага Камісарыяту Рабоча - Сялянскае Інспэкцыі БССР канкрэтныя прапановы, распрацаваныя на падставе рэвізійнае практыкі, аб спрашчэньні апарату кіраўніцтва, зьнішчэньні паралелізму і безгаспадарнасьці, аб формах узгадненьня дзейнасьці пасобных камісарыятаў і іх мясцовых органаў, а таксама аб зьмене ўсяе сыстэмы вядзеньня справы ў тых ці іншых установах ці іх пасобных частках;

д) рабіць прапановы ведамствам аб арганізацыі органаў рацыяналізацыі ведамсьцьвеннага апарату (плянавыя і арганізацыйныя бюро, дасьледчыя станцыі) і зацьвярджаць палажэньні пра парадак публічнае справаздачнасьці гэтых органаў аб рабоце і становішчы ўстаноў, а таксама рабіць прапановы пра зьмену кіруючага складу гэтых органаў;

е) рэгуляваць і ўзгадняць дзейнасьць адпаведных рэвізійных і кантрольных органаў;

ж) склікаць нарады і канфэрэнцыі для разгляду пытаньняў навуковае арганізацыі працы, вытворчасьці і тэхніці кіраўніцтва, парадку падліку і справаздачнасьці і г. д.; распрацоўваць плямы і праграмы і праводзіць разам з органамі асьветы і прафэсіянальнымі саюзамі падрыхтоўку і перападрыхтоўку работнікаў рознае кваліфікацыі ў галіне навуковае арганізацыі працы вытворчасьці і кіраўнічай тэхніці;

з) удзельнічаць з дарадчым голасам у камісіях і нарадах, якія арганізуюцца ў цэнтры і на мясцох, у пасяджэньнях калегій народных камісарыятаў, выканаўчых камітэтаў і іх прэзыдыумаў, ва ўсіх іншых ведамсьцьвенных і міжведамсьцьвенных нарадах, а таксама ў розных зьездах, канфэрэнцыях, распарадчых пасяджэньнях дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў і іх аб'яднаньняў, грамадзкіх і каапэрацыйных арганізацый і г. д.;

і) перадаваць у суд і ў адміністрацыйныя органы справы аб выяўленых Рабоча-Сялянскаю Інспэкцыяю злачынствах;

к) прапанаваць установам і прадпрыемствам спагнаць праз суд страты дзяржавы і самастойна ўзьнімаць у судзе такія справы;

л) апублікоўваць ад імя Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР сьпісы службовых асоб, злачынствы, праступкі, безгаспадарнасьць альбо нядбайнасьць якіх да інтарэсаў працоўных выяўлена пры рэвізіі.

Сьпісы службовых асоб, вінаватых у злачынствах, могуць апублікоўвацца толькі ў тым выпадку, калі гэта ня можа нашкодзіць правільнаму вядзеньню судовага сьледзтва;

м) прыпыняць відавочна незаконныя загады і дзеньні рэвізуемых устаноў і службовых асоб, прычым гэтае права не пашыраецца на пастановы і загады Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, Савету Народных Камісараў, народных камісарыятаў і іх калегій, мясцовых выканаўчых камітэтаў і іх прэзыдыумаў, а таксама на прысуды і пастановы судовых органаў і загады сьледчае ўлады і пракуратуры ў межах іх веданьня.

Увага. Права прыпыненьня тых ці іншых дзеяньняў і загадаў належыць Народнаму Камісару Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР.

8. Пастановы Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі, апроч пералічаных у артыкуле 9, могуць у тыдневы тэрмін ад дню іх прыняцьця быць апрэтэставаны адпаведнымі ведамствамі і ўстановамі ў вышэйшыя органы. Неапрэтэставаныя пастановы павінны неадкладна выконвацца.

9. Канчатковымі і абавязковымі для неадкладнага выкананьня ўсімі дзяржаўнымі і грамадзкімі установамі і прадпрыемствамі вьяўляюцца пастановы Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі па наступных пытаньнях:

а) аб спрашчэньні і скарачэньні падліку і справаздачнасьці;

б) аб ліквідацыі прадстаўніцтваў;

в) аб скарачэньні штатаў;

г) аб памяншэньні накладных выдаткаў;

д) аб зьмене структуры пасобных частак устаноў і прадпрыемстваў;

е) аб налажэньні дысцыплінарных пакараньняў, аб звальненьні службовых асоб за безгаспадарнасьць, бюракратызм і цяганіну.

Пастановы Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі па пытаньнях паказаных у п. п. „а" і „б", калі яны датычаць устаноў агульнасаюзнага значэньня, перадаюцца на зацьверджаньне Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі СССР.

10. На чале Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР стаіць Народны Камісар. Пры Народным Камісары Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі знаходзіцца Калегія, у склад якой уваходзяць Намесьнік Народнага Камісара і члены ў ліку, вызначаным Саветам Народных Камісараў БССР.

11. Народны Камісарыят Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР складаецца з наступных частак:

1) арганізацыйная група;

2) група па рацыяналізацыі дзяржаўнага апарату;

3) кантрольная група;

4) група транспарту і сувязі;

5) бюро скаргаў;

6) сакратарыяту.

Апроч таго, Народным Камісарам Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі могуць быць арганізаваны пасобныя інспэктарскія групы для выкананьня спэцыяльных заданьняў паводле гадовага пляну працы НК РСІ.

Пры Народным Камісарыяце Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі знаходзіцца Інстытут Дзяржаўных Бухгальтароў-Экспэртаў.

12. Разьмеркаваньне функцый паміж пасобнымі часткамі Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі БССР праводзіцца Народным Камісарам Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2 сакавіка 1929 г.,
г. Менск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену артыкулаў 11 і 13 Папраўна-Працоўнага Кодэксу БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

I. Арт. 11 Папраўна-Працоўнага Кодэксу БССР (З.З. БССР 1926 г. № 52, арт. 202) запісаць у наступнай рэдакцыі:

«11. Пры кожнай папраўна-працоўнай установе знаходзіцца наглядальная камісія, у складзе начальніка папраўна-працоўнае ўстановы (старшыня) і членаў—народнага судзьдзі, у райёне якога знаходзіцца даная папраўна-працоўная установа, члена мясцовага гарадзкога савету і прадстаўніка акруговага савету прафэсыянальных саюзаў».

II. Увагі да гэтага артыкулу пакінуць у сіле.

III. Арт. 13 Папраўна-Працоўнага Кодэксу запісаць у наступнай рэдакцыі:

«13. Пры акруговых папраўна-працоўных дамох знаходзіцца акруговыя разьмеркавальныя камісіі у складзе ўпаўнаважанага рабоча-сялянскае інспэкцыі (старшыня), начальніка акруговага папраўна-працоўнага дому (намесьнік старшыні), члена акруговага суду, члена прэзыдыуму акруговага савету прафэсыянальных саюзаў, члена мясцовага гарадзкога савету і члена камітэту дапамогі зьняволеным, якія знаходзяцца ў мясцох зьняволеньня і вызваленых з іх».

IV. Увагі да гэтага артыкулу пакінуць у сіле.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

2-га сакавіка 1929 г.,
гор. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении статей 11 и 13 Исправительно-Трудового Кодекса БССР.

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют:

I. Статью 11 Исправительно-Трудового Кодекса БССР (С. З. БССР 1926 г. № 52, ст. 202) изложить в следующей редакции:

«11. При каждом исправительно-трудовом учреждении состоит наблюдательная комиссия в составе начальника исправительно-трудового учреждения (в качестве председателя) и членов—народного судьи, в районе которого находится данное исправительно-трудовое учреждение, члена местного городского совета и представителя окружного совета профессиональных союзов".

II. Примечания к этой статье оставить в силе.

III. Ст. 13 Исправительно-Трудового Кодекса изложить в следующей редакции:

«13. При окружных исправительно-трудовых домах состоят окружные распределительные комиссии в составе уполномоченного рабоче - крестьянской инспекции (председатель), начальника окружного исправительно - трудового дома (заместитель председателя), члена окружного суда, члена президиума окружного совета профессиональных союзов, члена местного городского совета и члена комитета помощи содержащимся в местах заключения и освобождаемым из них».

IV. Примечания к этой статье оставить в силе.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

2 марта 1929 г.,
г. Минск.

Ад урадавае камісіі пры СНК БССР

па падрыхтоўцы правядзеньня 7-гадзіннага рабочага дню.

СЬПІС № 1.

У дадатак да нераведзеных на 7-мігадзінны рабочы дзень прадпрыёмстваў у БССР урадавая камісія па падрыхтоўцы 7-мігадзіннага рабочага дню пры СНК БССР агалашае наступны сьпіс прадпрыёмстваў, якія падлягаюць пераводу ў 1929 годзе на 7-мігадзінны рабочы дзень:

1. Сярніковая фабрыка „Чырвоная Барэзіна" (новая)—у ліпені.
2. Дрэваапрацоўчны камбінат у Бабруйску—у маі.
3. Шэйная фабрыка «Міншвэй» (новая)—у ліпені.
4. Галянтарэйная фабрыка ў Менску—у маі.

СТАРШЫНЯ ЎРАДАВАЕ КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ 7-МІГАДЗІННАГА РАБОЧАГА ДНЮ ПРЫ СНК БССР БЭНЭК.

АДКАЗНЫ СЭКРАТАР ГОЛЬБІНБЭРГ.

19 сакавіка 1929 г.

ХРОНІКА.

Рабочы зав. „Энэргія"—дэлегат райённага зьезду саветаў.

Фабком заводу «Энэргія» у свой час вылучыў некалькіх рабочых для працы ў падшэфным сельсавеце. Рабочыя дапамагалі сялянам праводзіць перавыбары саветаў, праводзілі гутаркі аб пасеўнай кампаніі, падвышэньні ўраджайнасьці, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і г. д.

Рабочы т. Данілевіч 2 тыдні працаваў ў вёсцы Заозер'е, Пярэжырскага сельсавету. Сяляне абралі т. Данілевіча дэлегатам на райённы зьезд саветаў.

Пазаўчора парт'ячэйка заводу «Энэргія» атрымала прывітальную тэлеграму ад Сьмілавіцкага райённага зьезду саветаў.

У тэлеграме райённы зьезд саветаў праз партыйную ячэйку вітае ўсіх рабочых заводу «Энэргія».

На Мар'інскім калёнізацыйным фондзе.

На Мар'інскім калёнізацыйным фондзе сёлета вясной будзе засеяна 600 гэкт., а ва зіму будзе ўзорана 2000 гэкт. Зараз на фондзе будуецца база для трактарнай калёны, якая будзе складацца з 15-ці трактараў.

Значная работа сёлета мае разгарнуцца па рэгуляваньню рэкі Арэсы. Нядаўна прыбыла землячарпалка в Нямеччыны, а другая землячарпалка ўжо выслана з Амэрыкі. Такім чынам, сёлета будуць працаваць 4 землячарпалкі.

У Менскай акрузе ачышчана 47 проц. насеньня.

На 15 сакавіка ў Менскай акрузе ачышчана 47 проц. насеньня, якое вызначана па пляну. Астрашыцка-Гарадзецкі райён ачысьціў звыш 71 проц., Заслаўскі—звыш 20 проц., Барысаўскі—53 проц., Бягомльскі—44,3 проц., Бярэзінскі—46 проц., Грэскі— 58,5 проц., Койданаўскі— 53,2 проц., Капыльскі—47,4 проц., Лагойскі—30 проц., Пухавіцкі—43,2 проц., Плешчаніцкі—50,6 проц., Смалявіцкі—77,3 пр., Сьмілавіцкі—40,4 проц., Самахвалавіцкі—57 проц., Чэрвенскі—54,7 проц., Узьдзенскі—19,2 проц., Халопеніцкі—37 проц.

Усебеларуская канфэрэнцыя рабочай моладзі.

ЦСПСБ 23 сакавіка склікае ўсебеларускую канфэрэнцыю рабочай моладзі. Канфэрэнцыя паміж іншымі пытаньнямі абгаворыць даклад ЦСПСБ аб становішчы і перспэктывах працы сярод моладзі, даклад Наркампрацы БССР аб становішчы беспрацоўя сярод падростку і меры барацьбы з ёю.

Перайменаваньне Варанецкага с.-г. тэхнікуму.

Наркамасьвеце БССР пастанавіў Варанецкаму Дзяржаўнаму сельска-гаспадарчаму тэхнікуму даць назву—Стара-Барысаўскі Дзяржаўны сельска-гаспадарчы тэхнікум імя т. Цурупы.

Перад загатоўкай квашаных кармоў.

У Менскай акрузе пачалі рыхтавацца да арганізацыі ям для квашаньня кармоў. У 13 калгасах будуць арганізаваны ямы на 700-800 пуд. Апроч гэтага, будуць арганізаваны 30 ям пры малочных арцелях па 400 пуд. кожная.

Радыё-навіны.

У Беларускім Радыё-Савеце.

На пасяджэньні Беларускага Радыё-Савету паміж іншымі пытаньнямі былі абгаворваны даклады Гомельскай радыё-станцыі і аб радыёфікацыі г. Менску.

Радыё-Савет для ўпарадкаваньня і паляпшэньня радыё-перадач запрапанаваў Гомельскай радыёстанцыі мець свае ўласныя перадачы толькі на 25 проц. штодзённай працы станцыі, а рэшту часу скарыстоўваць на трансляцыі з Менску і Масквы

Пытаньне аб радыёфікацыі Менску перадана ў ЦСПСБ для адшуканьня сродкаў, якіх патрабуецца каля 16.000 руб.

Радыё-Савет пастанавіў таксама вывярнуцца ў Беддзяржвыдавецтва з просьбай хутчэй выдаць на беларускай мове папулярныя кніжкі на радыё-тэхніцы.

Пачынае працаваць радыё-тэатр.

Беларускі Радыё-Цэнтр з 24 сакавіка аднаўляе канцэрты ў радыё-тэатры (у памяшканьні Цэнтр. Дому Салянина). У праграме першага канцэрту пойдзе 3-ці акт оперы «Фаўст» і цэлы шэраг іншых вакальных і музыкальных нумароў.

Радыё-тэатр кожнай пастаноўкай абслугоўвае да 150 сялян. Апрача таго, гэтыя канцэрты трансьліруюцца праз радыёстанцыю.

Да арганізацыі завочнага рабфаку.

На мясцох, відаць, яшчэ вельмі мала ведаюць аб тым, што арганізуецца ў Менску завочны рабфак. Нават ёсьць выпадкі, калі па некаторых райёнах адмаўляюцца пасьвядчаць анкеты і дакументы. Дагэтуль большасьць заяў на завочны рабфак атрымана ад сялянскай моладзі. Цікава адзначыць, што з Гомельшчыны і Віцебшчыны, якія вызначаюцца досыць буйнымі прамысловымі цэнтрамі, дагэтуль няма ніводнай заявы на завочны рабфак. Акруговым інспэктарыятам нарасьветы трэба прыняць меры да вырокай папулярызацыі сярод рабочай і сялянскай моладзі завочнага рабфаку.

Клюбнае будаўніцтва.

Падрыхтоўчая праца да будаўніцтва клюбаў у Менску і Віцебску для сакэу мэталістаў ужо скончана: поўнасьцю загатоўлены будаўнічыя матар'ялы і зроблена заяўка на рабочую сілу.

Пабудову гэтых клюбаў маркуецца скончыць сёлета да дню Кастрычнікавага сьвята. Пабудова клюбаў разам з абсталяваньнем будзе каштаваць звыш 500.000 руб. З агульнай сумы кожнаму клюбу адпушчана на поўнае абсталяваньне на 20.000 руб.

СУД.

П'яніца і гвалтаўнік.

Міхась Шкатула старшыня Лядненскага сельсавету, Чэрвенскага раёну—доўгі час служыў сэкратаром таго-ж сельсавету. Дзейнасьць Шкатулы вельмі падабалася кулакам і заможнікам—яны лічылі яго сваім чалавекам. На апошніх перавыбарах сельсавету Шкатула, калі выстаўляліся кандыдаты ў склад сельсавету, вакол сябе ўтварыў кулацкі блёк і зноў прайшоў у склад сельсавету, заняўшы пасаду старшыні. Кулакі і заможнікі былі здаволены выбарамі: Шкатула старшыня—значыць з ім можна выпіць, пакуціць і заўсёды быць упэўненым, што Шкатула не пакрыўдзіць таго, хто галасаваў за яго.

Аб тым, што Шкатула п'яніца і гвалтаўнік, ніхто на сходзе не ўсамянуў, бо Шкатула яшчэ перад сходам прыгразіў адпомсьціць таму, хто будзе яго крытыкаваць.

Пасьля перавыбараў сельсавету ца вёсак пашлі чуткі, што Шкатула пад судом і старшынёй будзе. Чуткі гэтыя былі правільныя: старыя грашкі Шкатулы ўсплылі на сьветлую ваду.

Будучы сэкратаром сельсавету і кіруючы справамі, Шкатула меў шырокае знаёмства з заможнікамі-кулакамі. Дзе толькі вясельле ці хрэсьбіны, Шкатула быў першым гасьцём і выпівае першую чарку.

Не адмаўляўся Шкатула ад гасьцініны, асабліва калі яны адбываліся ў рэлігійныя сьвяты. У тыя дні канцэлярыя сельсавету не працавала, а сэкратар гуляў з раніцы да позьняй ночы.

15 красавіка 1928 г. гр. вёскі Каляіна Кастусь Паўлоўскі спраўляў „вяліканьне". Было шмат гасьцей, а ў тым ліку і Шкатула.

Позна ноччу, калі госьці сталі разыходзіцца, Шкатула застаўся начаваць у Паўлоўскага. Адна з гасьцей Вольга Шамко (дзяўчына) спала недалёка ад ложка Шкатулы, які ноччу стаў прыставаць да Шамко і ўрэшце згвалціў яе.

Калі Шамко паскардзілася і супроць Шкатулы была ўзьнята справа, гвалтаўнік ад імя Шамко, без яе згоды, напісаў заяву, пасьведчыў яе і прыслаў у суд, што згвалтаваньня ня было, і што на Шкатулу яна паскардзілася дарэмна. Адзак, махінацыя Шкатулы правалілася.

Менскі акруговы суд, разгледзіўшы гэту справу, прыгаварыў Міхася Шкатулу за згвалтаваньне Шамко і дыскрэдытаваньне ўлады на тры гады зьняволеньня в суровым адмежаваньнем.

Д. К.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі.

1. «Сэрадэля-трава на кори, угнаеньне і насеньне» з 6 малюнкамі. Е. Аляксеў. Стар. 61, цана 18 кап.

2. „Дрыгва" п'еса ў трох дзеях, чатырох абразох. Ільля Гурскі. Стар. 121, цана 70 кап. Выданьне БДВ. Менск.

3 «Савецкае будаўніцтва» № 1, за 1929 год. Штомесячны палітыка-эканамічны журнал. Выданьне Дзяржплану БССР. Стар. 148, цана 75 кап.

За што прасьледваўся селькор Курагін.

ГАНЕБНЫЯ ФАКТЫ РАЗЛАЖЭНЬНЯ АДКАЗНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ РАСЬНЯНСКАГА РАЙЁНУ.—ПРАКУРАТУРА РЭСПУБЛІКІ СКОНЧЫЛА ПАПЯРЭДНЯЕ СЬЛЕДЗТВА ПА СПРАВЕ АБ ПРАСЬЛЕДВАНЬНІ СЕЛЬКОРА КУРАГІНА І ЗВАЛЬНЕНЬНЯ ЯГО З ПРАЦЫ.

Зьмест справы наступны. Сярод адказных працаўнікоў Расьнянскага раёну ў канцы 1927 г. пачалі выяўляцца факты разлажэньня: п'янкі, распуста і інш. Першым кандыдатам у гэтай хэўры быў сэкратар райкому КП(б)Б Чэрцікаў; начальнік міліцыі Данілюк, агент крымвышуку Лавараў і старшыня саюзу савгандльслужачых Жураўлёў былі вернымі памоцнікамі Чэрцікава. Агідныя паводзіны гэтай хэўры не маглі не зьвярнуць увагі сумленнай савецкай грамады і ўсіх сумленных працаўнікоў, да якіх адносіцца і селькор Курагін. Дзякуючы яму, аб паводзінах распусьнікаў даведаліся в газэт.

З гэтага часу пачынаецца прасьледваньне Курагіна в боку вышэйпералічаных асоб. Супроць Курагіна ўтвараецца штучна крымінальная справа: яго абвінавачваюць у забойстве дзіцяці грамадзянкі Тэрмоскінай. Дзеля гэтага яе прымушаюць даць ілжывае паказаньне, і Курагіна арыштоўваюць.

У дапамогу Чэрцікаву, Данілюку і Лавараву ў гэтай шайтанскай справе прыходзіць народны судзьдзя Лясковіч, у абавязкі якога ўваходзіць праверка законнасьці арышту Курагіна, але ён гэтага ня робіць, бо як жа выступіць супроць «сваіх» людзей? Праз тры тыдні Аршанская акруговая пракуратура вызваліла Курагіна і спыніла ўсю справу аб забойстве дзіцяці, знайстраванай так гладка рукамі Чэрцікава і кампаніі.

Не дабіўшыся тут посьпехаў, Чэрцікаў і інш. пачынаюць атаку на Курагіна з другога боку: выступаюць супроць яго аднаўленьня на працы прадаўцом у краме Цэнтрасьпірту. Старшыня саюзу савгандльслужачых Жураўлёў катэгарычна выступіў супроць аднаўленьня Курагіна, спасылаючыся на тое, што нібыта ён чалавек сваволны і пры тым яшчэ рамесьнік, у той час, як Курагін—бядняк і інвалід працы. Інспэктар Цэнтрасьпірту Бальшоў таксама стараўся дагадзіць Чэрцікаву і адмовіўся аднавіць у працы Курагіна, ня гледзячы на загад з цэнтру.

У выніку ўсяго гэтага, Курагін у працягу 14-ці месяцаў быў без працы. Толькі дзякуючы выезду спэцыяльнай камісіі ЦКК і рашэньню Вярхоўнага Суду Курагін быў адноўлен на працы ў студзені 1929 г.

Па гэтай справе прыцягваецца да судовай адказнасьці 6 асоб: Чэрцікаў—па 24, 196 і 198, Данілюк і Лавараў—па 198 і 212, Жураўлёў і Лясковіч—па 196 і Бальшоў—па 197 арт. Кр. Код. выключаецца 19 сьведак.

З прычыны вялікай цікавасьці да гэтай справы яна будзе разглядацца ў Вярхоўным Судзе Рэспублікі ў пачатку красавіка.

З ЛІСТОЎ РАБСЕЛЬКОРАЎ.

СА СПРАЎДОМУ—ДЫ Ў СЕЛЬСАВЕТ.

Ёсьць у мястэчку Нароўлі грамадзянін Гаравой Ш. Чалавек ён неспакойны і патрабуе „успакаіцельнага". Дзякуючы сваім «нэрвам», Гаравой быў аддан пад суд за „дробныя справы" і засуджан на адзін год зьняволеньня. Адбыў Гаравой свой тэрмін у папраўным доме і вярнуўся дамоў.

У гэты час патрабаваўся сакратар для мястачковага савету. Шукала «начальства» кандыдатуры і знайшло... Гаравога.

Далей болей: Гаравой ужо абран сакратаром мястачковага савету.

Цікава, ці нельга было знайсьці на гэту пасаду добрага чалавека бяз гэтакага стажу? Ці нельга правесьці паўторныя выбары?

Вока.

СЯЛЯНЕ РАЗВОДЗЯЦЬ САДЫ.

У вёсцы Баева агранам правёў растлумачальную працу аб карысьці садоўніцтва. Зараз сяляне пачалі разводзіць сады, а ў садох адводзіць пасекі для пчалаводзтва.

У выніку амаль у кожнага селяніна ёсьць хоць маленькі садзік.

Л.

КАМСАМОЛЬЦЫ—ЗА АРГАНІЗАЦЫЮ КАЛЕКТЫВУ.

У сяло Баева нецалы разоў прыяжджаў агранам і тлумачыў сялянам аб карысьці калектываў. Вясной 1928 году былі ўтвораны два калектывы, але з прычыны падрыву кулакоў да сярэдзіны лета калектывы распаліся. Зараз камсамольцы ўзяліся за ўтварэньне разам са сваімі бацькамі новага калектыву. Гэты калектыў да вясны расьпачне сваю працу.

Можна спадзявацца, што гэты калектыў не распадзецца і будзе прыкладам для ўсіх сялян.

Латыш.

УСІМ «ПАРОЎНУ».

У вёсцы Баравое, Лельчыцкага раёну ёсьць адзяленьне каапэратыву. Адзяленьне выдавала хлеб тым, якія на мяцоў свайго. Для разьмеркаваньня хлеба складаліся сьпісы па ўказаньнях камітэту ўзаемадапамогі. Разам з гэтым адзяленьне Лесбелу выпісала вагон шпанічнай мукі «для рабочых». Невядома, ці атрымалі рабочыя гэтую муку, але-ж служачыя канторы і іх знаёмыя—служачыя лясьніцтва і прыежджыя в райённыя центру іх знаёмыя па прафсаюзу атрымалі мукі колькі хацелі. Усе тыя, хто атрымаў муку з Лесбелу атрымліваюць яе таксама і з каапэрацыі. У выніку бедныя пазбавіліся здаваньняцца супольна з настаўніцтвам пайком у 10 фун. на душу ў месяц, а служачыя Лесбелу і Лясьніцтва атрымліваюць як хочуць. Цікава, чаму гэта так?

Асьветнік.

КААПЭРАВАЛІ ЎРАДНІКА.

Пятрыкоўскі гаркамітэт КСУ за гэты год каапэраваў шмат беднаты, але разам з ім і шмат заможных саматужнікаў, нават каапэраваў былога ўрадніка—начальніка турмы ў царск